WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
27 ЖНІЎНЯ 2011 г. СУБОТА № 163 (27027)
Кошт 750 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 26 жніўня разгледзеў шэраг кадравых пытанняў.**

**КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ НАЗНАЧЫЎ:**

**БАРЫЕВА Энвера Рызаевіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Туркменістане;

**ВАРАНЕЦКАГА Валерыя Іосіфавіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Аўстрыйскай Рэспубліцы, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях у Вене, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Харватыя па сумяшчальніцтве;

**ЖЫЛЕВІЧ Наталлю Іванаўну** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Карэя;

**ЧУШАВА Уладзіміра Мікалаевіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Сербія;

**РАДНЕНКУ Сяргея Валянцінавіча** — першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта.

**ПРЭЗІДЭНТ ТАКСАМА ДАЎ ЗГОДУ НА НАЗНАЧЭННЕ:**

**СІЦЬКО Міхаіла Міхайлавіча** — старшынёй Ваўкавыскага райвыканкама;

**КУЛІСЕВІЧА Антона Станіслававіча** — старшынёй Бераставіцкага райвыканкама;

**БАЛАХОНАВА Ігара Віктаравіча** — старшынёй Краснапольскага райвыканкама;

**КАРАЛЯ Аляксандра Міхайлавіча** — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Гданьску (Рэспубліка Польшча);

**МАЯНАВА Канстанціна Паўлавіча** — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гродна Азот»;

**КАСЦЮКОВА Ігара Анатольевіча** — намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва;

**СЕМЯНКЕВІЧА Дзмітрыя Ігаравіча** — намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва;

**МАТУСЕВІЧА Уладзіміра Уладзіміравіча** — намеснікам міністра інфармацыі;

**ШАДКО Дзмітрыя Генадзьевіча** — намеснікам міністра інфармацыі;

**КАЧАНАВАЙ Наталлі Іванаўны** — членам Віцебскага аблвыканкама;

**АНІШЧЫКА Сяргея Анатольевіча** — кіраўніком спраў, членам Гродзенскага аблвыканкама;

**ХАРЛАМЕНКАВАЙ Іны Феліксаўны** — намеснікам дырэктара дэпартамента мытна-тарыфнага і нетарыфнага рэгулявання Сакратарыята Камісіі Мытнага саюза.

Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да дыпламатаў, падкрэсліў, што ўсе яны людзі дасведчаныя і падрыхтаваныя, а таму няма неабходнасці ставіць перад імі нейкія асаблівыя задачы. «Няма неабходнасці ў гэтым складзе ставіць нейкія задачы перад вамі — усе вы людзі падрыхтаваныя, працавалі на немалых пасадах і выдатна разумееце з пункту гледжання палітыкі, дыпламатыі, што неабходна для нашай краіны», — сказаў ён.

«Вы разумееце, што ўся палітыка нашай дзяржавы — гэта наша эканоміка, экспарт, прасоўванне яго па ўсіх напрамках. У блізкейшы час, магчыма, да канца года або пачатку наступнага, мы збіромся і праанілізуем работу знешнепалітычных ведамстваў, а там і знешнеэгандлёвых прадстаўніцтваў, як яны працуюць па гэтых напрамках», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён са шкадаваннем канстатаваў, што тут існуе нямала праблем. «Тыя праблемы, якія ад выпадку да выпадку ўзнікаюць у нашай краіне, у тым ліку і фінансавыя, звязаны, перш за ўсё, з гэтым», — лічыць ён.

«Ваша задача — працаваць дзень і ноч і даваць канкрэтныя вынікі — гэта інвестыцыі і рэалізацыя праектаў па продажы нашых тавараў, нашай прадукцыі. Гэта галоўнае», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Анатоль РУБІНАЎ:** Абітурыент-2011

## «ТРЭБА ЎВОДЗІЦЬ ПАТРАБАВАННІ ДА МІНІМАЛЬНА ДАПУШЧАЛЬНАГА ЎЗРОЎНЮ ВЕДАЎ...»

**Ці можна стаць студэнтам ВНУ, маючы сярэдні бал атэстата 3,2 па дзесяцібальнай шкале і «двойкі» па ўсіх асноўных школьных дысцыплінах — фізіцы, матэматыцы, хіміі і мове? Здаровы сэнс падказвае, што гэта немагчыма. Між іншым, такі абуральны выпадак сёлета меў месца ў Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя акадэміка А.Д. Сахарава. І хоць уладальнік такога «бліскучага» атэстата змог стаць студэнтам толькі платнай формы навучання, тым не менш факт застаецца фактам — прэтэндавалі на атрыманне дыплома аб вышэйшай адукацыі можа сёння любы ахвотны.**

— Вышэйшая адукацыя стала ў нашай краіне ўжо не проста масавай, а фактычна ўсеагульнай, што непазбежна прыводзіць да рэзкага зніжэння яе якасці і да істотнай дэфармацыі рынку працы, — упэўнены **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах у 2011 годзе Анатоль РУБІНАЎ**. — Колькасць тых, хто паступіў у ВНУ, у нас амаль удвая перавышае колькасць тых, хто пайшоў навучацца ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Атрымліваецца, што на аднаго рабочага ў нас будзе два інжынеры? Увогуле колькасць месцаў у ВНУ сёлета амаль на 40 працэнтаў перавышала колькасць выпускнікоў адзінаццатых класаў...

На сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры Анатоль Рубінаў агучыў высновы, да якіх прыйшлі сёлета члены дзяржаўнай камісіі, і прапановы па ўдасканаленні парадку прыёму, якія будуць перададзены на разгляд кіраўніка нашай дзяржавы.

— Сёлета сярэдні конкурс у ВНУ і на дзённую, і на завочную форму навучання крыху знізіўся і склаў 1,9 чалавека на месца, — паведаміў Анатоль Рубінаў. — Летась на дзённай форме навучання конкурс быў 2, а на завочнай — 2,3 чалавека на месца. Самымі складанымі дысцыплінамі для абітурыентаў, як і ў папярэдні гады, аказаліся на цэнтралізаваным тэсціраванні фізіка і матэматыка. Напрыклад, па фізіцы 20 балаў і менш набрала каля 10 працэнтаў абітурыентаў, а па матэматыцы — 61,7 працэнта. Колькасць уладальнікаў стабальных сертыфікатаў сёлета знізілася і склала 65 чалавек. За «нуль» балаў не выбіла 612 чалавек. Прыблізна палова ўладальнікаў стабальных сертыфікатаў — мінчане, але ёсць сярод уладальнікаў такіх бліскучых вынікаў і прадстаўнікі навучальных устаноў, размешчаных у райцэнтрах і невялікіх населеных пунктах.

Пазітыўнай тэндэнцыяй можна лічыць той факт, што выпускнікі сельскіх школ па выніках цэнтралізаванага тэсціравання зусім нязначна адстаюць ад гараджан, і гэта пры адсутнасці ў сельскай мясцовасці інстытута рэпетытарства. Прычым па чатырох дысцыплінах яны ўжо нават апярэджваюць абітурыентаў-гараджан: сярэдні бал у іх вышэйшы па геаграфіі, беларускай, іспанскай і нямецкай мовах.

СТАР. 2

## НАСТАЎНІЦКІ «КВЕТНІК»!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Сёлетнія выпускніцы з дыпломамі настаўнікаў Вольга Бернат, Алена Саленік, Настасся Лукомская, Вольга Цай, Вераніка Васіленка, Маргарыта Чэчнева накіраваны працаваць у школы Кастрычніцкага раёна сталіцы. Сярод іх сацыяльны педагог, выхавацелі ясляў і садоў, настаўнікі замежных моў. На раённай настаўніцкай канферэнцыі маладых спецыялістаў блаславілі ў шчаслівы працоўны шлях іх старэйшыя калегі.**

Грошы

## НАЦБАНК НЕ ЗАБАРАНЯЎ БАНКАМ ПРАДАВАЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВУ НАЯЎНУЮ ВАЛЮТУ

**Упраўленне інфармацыі Нацыянальнага Банка Беларусі абвяргае паведамленні, якія апошнім часам з'явіліся ў СМІ, пра тое, што быццам Нацбанк «забараніў камерцыйным банкам рэспублікі прадаваць насельніцтву наяўную замежную валюту праз абменныя пункты». Гэта інфармацыя абсалютна не адпавядае рэчаіснасці.**

Ліст Нацыянальнага банка ад 23.08.2011 № 21-18/179 з прапановай разгледзець пытанне аб ажыццяўленні асобнымі абменнымі пунктамі і касамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі буйных гандлёвых цэнтраў і рынкаў, аперацый толькі па куплі наяўнай валюты з аплатай у наяўных беларускіх рублях для далейшага накіравання гэтай валюты на продаж насельніцтву на сацыяльна значныя патрэбы быў накіраваны ў адрас толькі шасці сістэмаўтваральных банкаў краіны. Дарэчы, падрыхтаваны ліст быў у адпаведнасці са зваротам Асацыяцыі беларускіх банкаў.

Рашэнне было прынята для ўпарадкавання сітуацыі вакол абменных пунктаў. Маніторынг паказаў, што каля абменнікаў у буйных гандлёвых цэнтрах і на рынках утвараюцца вялікія чэргі. Пры гэтым у чэргах практычна прысутнічаюць адны і тыя ж асобы, якія, хутчэй за ўсё, набываюць валюту для далейшага продажу яе на тых сегментах валютнага рынку, якія не рэгулююцца. Да таго ж чэргі каля абменных пунктаў перашкаджаюць працы персаналу гандлёвых цэнтраў і рынкаў і ствараюць нязручнасці для пакупнікоў.

Таму буйным беларускім банкам, якія маюць абменнікі на такіх тэрыторыях, далі права сумесна з кіраўніцтвам гандлёвых аб'ектаў вызначыцца, ці хочуць яны выкарыстоўваць прапанаваны рэжым працы і ў якіх канкрэтных абменных пунктах.

Усе астатнія абменнікі Беларусі, гэта значыць абсалютная большасць, будуць ажыццяўляць аперацыі як па куплі, так і па продажы валюты.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## МІНЭКАНОМІКІ: АДНАВІЦЬ ДАВЕР ДА ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ МОЖНА ПРАЗ ВЫХАД НА АДЗІНЫ КУРС



**ПРА вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, пра тэндэнцыі ў развіцці эканомікі па выніках сямі месяцаў, а таксама аб прагнозах на будучыню з журналістамі пагаварыў Антон ДАЎГАВЕЧНЫ, начальнік галоўнага ўпраўлення макраэканамічнага аналізу і прагназавання Міністэрства эканомікі.**

— Па выніках 7 месяцаў захаваліся высокія тэмпы росту ВУП — 9,8%. Гэта шмат, гэта высокія тэмпы, але хачу адзначыць, што ў параўнанні з папярэднім годам змяніліся асноўныя фактары прыросту ВУП. У першую чаргу рэзка павялічылася значнасць гандлю ў фарміраванні гэтага прыросту: калі за 7 месяцаў 2010 года доля гэтага віду эканамічнай дзейнасці складала 17,6% у прыросце, то сёлета — 31,6%, — сказаў Антон Даўгавечны, і растлумачыўшы такое павышэнне пашырэннем сукупнага ўнутранага попыту (асабліва ў красавіку і маі), які, у сваю чаргу, звязаны з дэвальвацыйнымі і інфляцыйнымі чаканнямі.

У фарміраванні прыросту ВУП павялічылася таксама і доля падаткаў — з 5,9% да 11,2%. Бо з-за росту рознічнага тавараабароту і росту цэн павялічыліся паступленні чыстых падаткаў.

Што тычыцца суадносін росту экспарту і імпарту, то тут Антон Даўгавечны бачыць станоўчыя зрухі:

— Недзе пачынаючы з моманту дэвальвацыі усё больш заўважна тэндэнцыя павелічэння ўплыву знешняга фактару на развіццё эканомікі. Гэта пацвярджаецца нарастаннем апераджэння тэмпаў росту экспарту ў параўнанні з ростам імпарту. Па папярэдніх звестках, у студзені-ліпені гэтае апераджэнне будзе складаць ужо каля 12%. Больш за тое, у ліпені мы чакаем станоўчае сальда таварамі. Яго велічыня па папярэдняй ацэнцы — каля 100-150 млн долараў. А з улікам паслуг велічыня станоўчага сальда можа скласці 250 млн і вышэй.

Павелічэнне ўплыву знешняга попыту на фарміраванне ВУП таксама пацвярджаецца ростам долі экспарту ў прамысловай прадукцыі, якая выпускаецца. Калі ў першым квартале адносіны экспарту да выробленай прадукцыі складалі менш за 50%, то ў другім — больш за 59%, а ў ліпені — каля 64%.

— Гэта дастаткова шмат. Наша прамысловасць усё ў большай ступені арыентуецца на экспарт. Асноўная прычына — гэта скарачэнне сукупнага попыту, якое адбываецца і з-за мераў ураду (узмацненне бюджэтнай дысцыпліны, абмежавання эмісійных працэсаў), і з-за фактараў не зусім прыемных — у прыватнасці, з-за дэвальвацыі нацыянальнай валюты, з-за росту цэн, які апераджае рост грашовых даходаў.

У Мінэканомікі перакананыя, што ў выпадку, калі не будзе нейкіх фактараў, якія акажуць істотны ўплыў на павелічэнне ўнутранага попыту, тэндэнцыя арыентацыі прамысловасці на знешні рынак будзе захоўвацца. У выніку гэта прывядзе да таго, што сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, як сказаў Антон Даўгавечны, «пагаршацца моцна не будзе». Праўда, канкрэтных лічбаў ён не назваў, але выказаў думку, што прагнозныя параметры ў гэтай частцы будуць выкананы.

СТАР. 2

## РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### АПОШНІ ПОДЫХ ЛЕТА, А ПОТЫМ ВОСЕНЬСКІЯ ДАЖДЖЫ

**У апошнія выхадныя лета на тэрыторыю Беларусі завітае даволі цёплае паветра з боку Міжземнамор'я, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў суботу, пад уплывам антыцыклона з цэнтрам над Варонежскай вобласцю Расіі, у Беларусі захаваецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е. Вецер паўднёва-ўсходні, удзень парывісты. Максімальная тэмпература ўдзень 23—29, месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях да 31 градуса.

І ў нядзелю большая частка краіны застанецца пад аховай антыцыклону, толькі ўдзень у заходніх раёнах пройдзе кароткачасовы дождж, магчыма навальніца. Уначы будзе 9—16, удзень ад 20 градусаў на паўночным захадзе, да плюс 28 на паўднёвым усходзе краіны.

У першыя дні наступнага тыдня атмасферны фронт з боку Польшчы працягне свой рух далей на ўсход кантынента. Таму ў панядзелак у асобных раёнах чакаюцца невялікія дажджы. Уначы будзе 8—15, удзень ад 19 градусаў на поўначы да 27 цяпла на паўднёвым усходзе. Бліжэй да сярэдзіны наступнага тыдня атмасферныя франты прынясуць кароткачасовыя дажджы ўжо на ўсю тэрыторыю краіны. У аўторак будзе 19—26, у Гомельскай вобласці — да 28 градусаў. Прагназуецца, што ў сераду крыху пахаладае, таму ўдзень чакаецца ўсяго 16—23 цяпла, на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей — да 25 градусаў.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, 1 верасня Беларусь застанецца ў зоне паніжанага ціску. Удзень магчымыя невялікія дажджы. Тэмпература ўначы на першы дзень восені 6—13, удзень — 16—23, у Мінску чакаецца каля 20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### КОШТЫ НА МЯСНЫЯ ПАЎФАБРЫКАТЫ ЎЖО НЕ АБМЯЖОЎВАЮЦЦА

**Пастановай Міністэрства эканомікі № 137 ад 24 жніўня 2011 года прадугледжана, што сельскагаспадарчым арганізацыям, фермерскім (сялянскім) гаспадаркам, мясаперапрацоўчым арганізацыям і арганізацыям спажывецкай кааперацыі не трэба прымяняць гранічныя максімальныя адпускныя цэны на мяса (ялавічыну і свініну) пры фарміраванні цэн на мяса і мясныя паўфабрыкаты, якія рэалізоўваюцца на рынках і кірмашах. Як адзначаецца ў прэс-рэлізе Міністэрства эканомікі, такі крок зроблены па прапанове Мінсельгасхарча «ў мэтах павелічэння аб'ёмаў рэалізацыі мяса на рынках рэспублікі, у мэтах выключэння яго спекулятыўных продажаў і стварэння канкурэнтнага асяроддзя».**

У Мінэканомікі адзначылі, што да гэтага вытворцы і арганізацыі спажыўкааперацыі фарміравалі адпускныя цэны на мясныя паўфабрыкаты, зыходзячы з гранічных максімальных адпускных цэн, у сувязі з чым гандляваць на рынках і кірмашах ім было нявыгадна, а значыць, гэта адбівалася і на аб'ёмах паставак. Больш за тое, прадукцыя, якую прадавалі вытворцы, часта аказвалася ў распараджэнні перакупшчыкаў — а яны ўжо перапрадавалі мяса і паўфабрыкаты нашмат даражэй. Прыняцце пастановы № 137, як напісана ў каментары Міністэрства эканомікі, павінна павялічыць аб'ём прапановы мяса, бо зараз вытворцы пастаўленыя ў роўныя ўмовы з іншымі ўдзельнікамі рынку.

**Павел БЕРАСНЕЎ, Сяргей ПАЛІНІН.**

### ЗВАДКАВАНЫ ГАЗ НА АЎТАГАЗАЗАПРАЎКАХ БЕЛАРУСІ З 1 ВЕРАСНЯ ПАДАРАЖЭЕ НА 10 ПРАЦЭНТАЎ

**У Беларусі з 1 верасня гэтага года на 10 працэнтаў павялічваюцца адпускныя цэны арганізацый-вытворцаў на вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя газы для аўтамабільнага транспарту, а таксама гранічныя розничныя цэны на звадкаваны газ для запраўкі аўтамабільнага транспарту пры рэалізацыі на аўтамабільных газазаправачных станцыях, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аддзеле сувязяў з грамадскасцю Міністэрства эканомікі Беларусі.**

Такое рашэнне змешчана ў пастановах Міністэрства ад 19 жніўня гэтага года № 133 «Аб унясенні змяненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 4 красавіка 2011 года № 52» і № 134 «Аб устанаўленні гранічных розничных цэн на звадкаваны газ пры рэалізацыі на аўтамабільных газазаправачных станцыях».

Такім чынам, на аўтамабільных газазаправачных станцыях гранічная мінімальная цана звадкаванага газу з 1 верасня вырасце з Br2370 за літр да Br2600, гранічная максімальная — з Br2550 да Br2800. «Звадкаваны газ у Беларусі выпрацоўваецца ў асноўным з імпартуемай сыравіны. Дзейныя цяпер адпускныя цэны на звадкаваны газ не забяспечваюць рэнтабельную работу арганізацый, якія яго выпрацоўваюць», — растлумачылі ў Міністэрстве эканомікі Беларусі прычыну павышэння цэн.

### НА ПЕРАКРЫЖАВАННІ ЗАГІНУЎ ЧАЛАВЕК

**Напрыканцы працоўнага дня ў пятніцу ў Магілёве адбылося дарожна-транспартнае здарэнне з трагічным зыходам.**

На перакрыжаванні вуліц Залуцкага і Дзімітрава адзін аўтамабіль зачапіў іншы і адляцеў на людзей, якія на зялёнае святло сталі пераходзіць дарогу. У выніку 1 чалавек загінуў, трое атрымалі траўмы. Гэта папярэдняя інфармацыя, ДАІ праводзіць праверку.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ЛАБАВОЕ СУТЫКНЕННЕ ЛЕГКАВІКА І АЎТОБУСА

**Гэтае здарэнне адбылося ў горадзе Іванава па вуліцы Гагарына пасля васьмі гадзін вечара.**

Вадзіцель легкавога аўтамабіля «Фальксваген-Джэта» 1984 года выпуску (сам, дарэчы, таго ж года нараджэння) не справіўся з кіраваннем, выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з маршрутным аўтобусам «ПАЗ». Апошні вяртаўся з аўтавакзала ў парк. У выніку дарожна-транспартнага здарэння машыны атрымалі механічныя пашкоджанні. Відавочца выклікаў выратавальнікаў, якія пры дапамозе гідраўлічнага інструменту дасталі з салона легкавіка кіроўцу. Ён з рознымі траўмамі быў дастаўлены ў Іванаўскую цэнтральную раённую бальніцу. Кіроўца аўтобуса не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*


АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис» (продавец)** проводит открытый аукцион по продаже **здания кондитерского цеха** (инв. № 640/С-27572), об. пл. **711,2 кв.м**, расположенного по адресу: **Минская область, Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 23А.**

**Начальная цена с НДС – 1 000 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – 1,3700 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования; ограничения (0,0172 га) – охранная зона магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных сооружений).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **28.09.2011 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 27.09.2011 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


ISSN 1990 - 763X

### МАЛЕБЕН ПРА ВУЧНЯЎ

Сёння ў праваслаўным Свята-Троіцкім храме ў Быхаве пройдзе малебен у сувязі з новым навучальным годам. Вернікі будуць маліцца за здароўе дзяцей і іх поспехі ў навучанні. Усіх прысутных акропяць святой вадой. **Ул. інф.**


ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1.** Автомобиль ГАЗ-САЗ-3507 гос. № АА9769-2, 1990 года выпуска **Лот № 2.** Автомобиль УАЗ 3303 гос. № АВ1635-2, 1991 года выпуска |
| Собственник (владелец) имущества | РСЧУП «Теплотехник» |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Орша, ул. Ленина, 234а |
| Стоимость имущества | **Лот № 1** – 6 808 320 белорусских рублей (с учетом НДС) **Лот № 2** – 2 868 480 белорусских рублей (с учетом НДС) |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. Правды, 32 9 сентября 2011 года в 12.00 |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 320 http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс. (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 15.08.2011. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1.** Автомобиль Geely CK, 2008 г.в. гос. № 2-6413 ВЕ-2; **Лот № 2.** Автомобиль Geely CK, 2008 г.в. гос. № 2-4733 ВА-2; **Лот № 3.** Автомобиль Geely MK, 2008 г.в. гос. № 2-4859 АС-2; **Лот № 4.** Автомобиль Geely MK, 2008 г.в. гос. № 2-7271 ВЕ-2. |
| Собственник (владелец) имущества | ЧТУП «Комфорт Лайн» |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Орша, ул. Белинского, 52 |
| Стоимость имущества | **Лот № 1** – 10 243 278 белорусских рублей (с учетом НДС); **Лот № 2** – 13 480 515 белорусских рублей (с учетом НДС); **Лот № 3** – 17 399 700 белорусских рублей (с учетом НДС); **Лот № 4** – 17 516 538 белорусских рублей (с учетом НДС). |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. Правды, 32 14 сентября 2011 года в 11.00 |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 320 http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс. (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 15.08.2011. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1.** ½ доли капитального строения одноквартирного жилого дома с инвентарным номером 235/С-2021 |
| Собственник (владелец) имущества | ИП Кувшинов Ю.А. |
| Местонахождение (адрес) имущества | д. Абузерье, Лукомльский с/с, Чашникский район, Витебская область |
| Стоимость имущества | Лот № 1 – 2 800 000 белорусских рублей (без НДС) |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 316 06 сентября 2011 года в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Коржов Алексей Игоревич тел./факс. (80212) 49 13 47, (8 029) 366 40 10, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, **не позднее 14 ч. 30 м. 06.09.2011 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |


КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ, УСТАНОЎЛЕНЫЯ НБ РБ з 27.08.2011 г. (ДЛЯ Б/Н РАЗЛІКАЎ)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 5 061,00 | 1 чэшская крона | 301,73 |
| ▼ 1 еўра | 7 306,06 | 1 польскі злоты | 1 755,58 |
| 1 латвійскі лат | 10 305,44 | ▲ 1 расійскі рубель | 175,29 |
| 1 літоўскі літ | 2 117,04 | 1 украінская грыўня | 633,08 |

КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ ДЛЯ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ ЦЭНТРАБАНК РФ

| | |
|---|---|
| USD | 28,8717 |
| 10 UAH | 36,0905 |
| 10000 BYR | 57,1264 |
| EUR | 41,6705 |

# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 5 (5)

«Блакітныя каскі»

# МІРАТВОРЧЫЯ РЭСУРСЫ ПЛАНЕТЫ: БЕЛАРУСКІ ЎКЛАД

**9 жніўня 2011 года быў падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і ўрадам Беларусі, згодна з якім выдзяляюцца рэсурсы для міратворчай місіі ААН у Ліване. Мемарандум стаў асновай для развіцця далейшага супрацоўніцтва Беларусі і ААН у сферы міратворчай дзейнасці.**



Вайскоўцы міратворчай роты 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады (Беларусь) падчас вучэнняў.

Фота Андрэя АРЦЮХОЎСКАГА.

З боку ААН подпіс пад дакументам паставіла намеснік генеральнага сакратара Сюзана Малькора, з беларускага боку — намеснік дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, генерал-маёр Станіслаў Зась. У мемарандуме замацаваныя міжнародна-прававы статус беларускіх вайскоўцаў, накіраваных у склад Часовых сіл ААН у Ліване (ЧСААНЛ), а таксама адміністрацыйныя, матэрыяльна-тэхнічныя і фінансавыя ўмовы, якія рэгулююць прадастаўленне Беларуссю персаналу, маёмасці і паслуг у падтрымку місіі ААН.

Цяпер у складзе ЧСААН выконваюць задачы трое грамадзян Беларусі — афіцэр штаба міратворчага кантынгенту і два ўрачы медыцынскага шпіталя місіі ў населеным пункце Накура.

Як вядома, 29 мая, пачынаючы з 2002 года, традыцыйна адзначаецца Міжнародны дзень міратворцаў ААН. У гэты дзень у 1948 годзе Савет Бяспекі ААН заснаваў першую ў гісторыі міратворчую місію — па наглядзе за перамір'ем у Палесціне. У сваім пасланні з гэтай нагоды ў 2002 годзе Генеральны сакратар ААН Кофі Анан адзначыў, што тады мала хто мог уявіць, да якой ступені зменіцца дзейнасць ААН па падтрыманні міру. Новым элементам стаў актыўны ўдзел у міратворчай дзейнасці шэрагу постсавецкіх дзяржаў — самы прыкметны ўклад у працу ААН па падтрыманні міру ўносяць Расія і Украіна.

У цэлым сёння ў 18 аперацыях, якімі кіруе Дэпартамент аперацый па падтрыманні міру ААН, удзельнічаюць больш за 72 000 вайскоўцаў і 15 000 цывільных асоб. Такім чынам, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый з'яўляецца найбуйнейшай у свеце шматбаковай арганізацыяй, якая вырашае задачы постканфліктнай стабілізацыі.

З постсавецкіх дзяржаў у міратворчай дзейнасці ААН таксама бяруць удзел Кыргызстан, Літва, Малдова і Эстонія. Ваенныя назіральнікі з Эстоніі сёння нясуць службу ў самай першай міратворчай місіі — Органе ААН па наглядзе за выкананнем умоў перамір'я (у Палесціне). Восем супрацоўнікаў грамадзянскай паліцыі з Літвы дапамагаюць у стварэнні косаўскай паліцыі. Сёння «блакітныя каскі» не проста сочаць за захаваннем дамоваў аб спыненні агню. Цяперашнія міратворчыя аперацыі становяцца ўсё больш складанымі, часта вырашаючы доўгачасовыя задачы ўзнаўлення краін. «Блакітныя каскі» прымаюць удзел у арганізацыі выбараў, у рэфармаванні паліцыі і судовай сістэмы, займаюцца абаронай правоў чалавека і праектамі па размініраванні.

Летась 22 лютага ў штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку прайшла сесія спецыяльнага камітэта ААН па аперацыях па падтрыманні міру, у працы якой удзельнічала дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале з намеснікам дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі, генерал-маёрам Станіславам Засем. Наша краіна прымае актыўны ўдзел у многіх сферах дзейнасці ААН і з'яўляецца донарам бяспекі ў Еўразійскім рэгіёне.

Імкнучыся быць актыўным удзельнікам міжнароднай сістэмы бяспекі, Рэспубліка Беларусь адгукнулася на просьбу Генеральнага сакратара ААН і прыняла рашэнне аб паступовым падключэнні да ўдзелу ў аперацыях ААН па падтрыманні міру. Гэта абумоўлена тым, што наша краіна адводзіць першарадную ролю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у пытанні забеспячэння міжнароднага міру і бяспекі і выступае супраць любых несанкцыянаваных дзеянняў у абыход рашэнняў Савета Бяспекі ААН.

Варта адзначыць, што падключэнне да міратворчай дзейнасці ААН стане важным палітычным крокам, які павысіць аўтарытэт нашай краіны на міжнароднай арэне, замацуе за Рэспублікай Беларусь імідж актыўнага ўдзельніка сістэмы міжнароднай бяспекі і будзе спрыяць стварэнню новых механізмаў для адстойвання сваіх знешнепалітычных інтарэсаў.

Падключэнне да міратворчай дзейнасці не запатрабуе фінансавых выдаткаў, бо ў ААН выпрацавана сістэма кампенсацый, якая прадугледжвае пакрыццё выдаткаў у поўным аб'ёме. Акрамя таго, па некаторых кірунках (напрыклад, прыцягненне да міратворчых задач верталётнай і інжынернай тэхнікі) краіна-донар атрымлівае грашовыя сродкі, якія перавышаюць выдаткі.

Немалаважным з'яўляецца таксама той факт, што вайскоўцы, якія прымаюць удзел у міратворчых місіях, набываюць велізарны прафесійны досвед ва ўрэгуляванні міжнародных канфліктаў, удасканальваюць навыкі працы ў складзе міжнародных штабоў, падраздзяленняў і ўменне эфектыўна дзейнічаць у складаных і нестандартных умовах. Накіраванне беларускіх вайскоўцаў для ўдзелу ў міратворчых місіях будзе ажыццяўляцца ў строгай адпаведнасці са створанай нарматыўнай прававвой базай.

На пачатковым этапе прадугледжваецца накіраванне ў місіі асобных спецыялістаў для ўдзелу ў складзе шматнацыянальных штабоў, ваенных наглядальнікаў, а таксама ў падраздзяленні забеспячэння. У далейшым, з набыццём досведу, прадугледжваецца нарасціць фармат удзелу да воінскага падраздзялення. Немалаважна, што беларускія вайскоўцы будуць накіроўвацца ў місіі, спалучаныя з мінімумам рызыкі для іх жыцця і здароўя. Спецыялісты з Беларусі — як грамадзянскія, так і ваенныя — здольныя годна прадставіць нашу краіну ў місіях ААН.

Удзел Беларусі ў аперацыях па падтрыманні міру (АПМ) забяспечыць доступ да тэарэтычнага і практычнага вывучэння сучасных, заснаваных на сусветным досведзе, метадаў разгортвання ваенных і грамадзянскіх аперацый, накіраваных на падтрыманне міру, недапушчэнне эскалацыі канфлікту і забеспячэнне бяспекі. Падключэнне да АПМ дасць унікальную магчымасць набыцця досведу ва ўрэгуляванні канфліктаў у сучасных геапалітычных умовах, вопыту для падрыхтоўкі войскаў, а таксама ў значнай меры будзе садзейнічаць развіццю ваеннага супрацоўніцтва Беларусі з іншымі дзяржавамі.

У цяперашні час тэма павышэння эфектыўнасці міратворчай дзейнасці з'яўляецца адной з найбольш актуальных у ААН. Ва ўмовах, калі пераважная большасць краін свету прымаюць удзел у АПМ, актыўнасць Беларусі на гэтым кірунку будзе расцэньвацца сусветнай супольнасцю як рэальны ўклад ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі.

Аперацыі ААН па падтрыманні міру з'яўляюцца адным з асноўных спосабаў рэагавання міжнароднай супольнасці на канфлікты. Міжнародны характар місій па падтрыманні міру, якія ажыццяўляюцца на падставе санкцыі Савета Бяспекі ААН, забяспечвае ўнікальную легітымнасць любой аперацыі ААН на карысць міру. Міратворчыя аперацыі ААН з'яўляюцца непрадузятым і шырока прызнаным механізмам як справядлівага размеркавання абавязкаў па падтрыманні міру, так і прыняцця эфектыўных мер.

У абслугоўванні ваенных кантынгентаў ААН з'яўляецца эфектыўнай і пры гэтым эканамічнай арганізацыяй. Яе спецыялізаваныя ўстановы валодаюць шырокім дыяпазонам грамадзянскіх і ваенных магчымасцяў. За час існавання арганізацыі міратворцы ААН ажыццявілі больш як 60 палявых місій і забяспечылі заключэнне 172 мірных пагадненняў, якія паклалі канец рэгіянальным канфліктам.

Аперацыі ААН на карысць міру патрабуюць менш сродкаў, чым іншыя формы міжнароднага ўмяшання. Эканамісты Оксфардскага ўніверсітэта вызначылі, што міжнародныя ваенныя аперацыі, якія праводзяцца на падставе Главы VII Статута ААН, з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі, з пункту гледжання выдаткаў, спосабамі змяншэння небяспекі аднаўлення канфліктаў.

**Мікалай ЛЯЎЧУК,**
**ваенна-інфармацыйнае агенцтва Узброеных Сіл «Ваяр» — спецыяльна для «Звязды».**

# Вучэнні з войскамі Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання

**Пачалася перадыслакацыя тэхнікі і асабовага складу часцей і злучэнняў Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь на палігон «Ашулук» Астраханскай вобласці, дзе пройдзе актыўная фаза вучэнняў з баявымі стрэльбамі. Прыбыццё першых эшалонаў з асабовым складам запланавана на 28 жніўня.**

18 жніўня 2011 года ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі войскаў пад кіраўніцтвам камандуючага войскамі Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання пачаліся тактычныя вучэнні з войскамі Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Баявыя разлікі зенітных ракетных часцей правядуць баявыя стрэльбы, а лётны састаў адпрацуе задачы па знішчэнні паветраных цэляў у складзе беларускай групоўкі падчас сумесных кааліцыйных вучэнняў з баявымі стрэльбамі «Баявая садружнасць 2011».

Асноўнымі мэтамі вучэнняў з'яўляюцца: удасканаленне практычных навыкаў камандзіраў і штабоў па кіраванні войскамі; павышэнне вывучкі разлікаў падчас выканання вучэбна-баявых задач у месцах пастаяннай дыслакацыі; адпрацоўка пытанняў перадыслакацыі воінскіх часцей у новы пазіцыйны раён і выкананне там баявых стрэльбаў; павышэнне практычных навыкаў асабовага саставу падраздзяленняў і воінскіх часцей пры адбіцці паветраных ударэў.

Падчас вучэнняў асабовы састаў воінскіх часцей выканае марш чыгуначным, паветраным і лётнымі эшалонамі на палігон «Ашулук», дзе правядзе баявыя стрэльбы.

Для выканання вучэбна-баявых задач на палігоне «Ашулук» прыцягваюцца баявыя разлікі зенітных ракетных і радыётэхнічнай брыгады, а таксама экіпажы самалётаў МіГ-29 і знішчальнай авіяцыйнай базы, падраздзяленні сувязі і абслугоўвання. Для выканання задач вучэнняў будуць задзейнічаны зенітныя ракетныя комплексы «С-300», «Бук» і «Аса».

Выкананне задач вучэнняў на палігоне «Ашулук» дазволіць праверыць у абставінах, блізкіх да рэальных, новыя сістэмы аўтаматызацыі айчыннай вытворчасці ўсіх узроўняў.

Цеснае супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй дазваляе нашым разлікам атрымаць практыку баявых стрэльбаў як самастойна, так і ў межах праводзімых кааліцыйных вучэнняў «Баявая садружнасць» адзінай сістэмы супрацьпаветранай абароны краін — удзельніц АДКБ.

Пасля падпісання ў 1996 годзе Пагаднення «Аб парадку прадастаўлення Расійскай Федэрацыяй Рэспубліцы Беларусь ваенных палігонаў для правядзення стрэльбаў воінскімі часцямі СПА Рэспублікі Беларусь» паміж міністэрствамі абароны Беларусі і Расіі першымі практыку баявых стрэльбаў атрымалі разлікі 15-й зенітнай ракетнай брыгады.

За больш чым 15 гадоў практыку баявых стрэльбаў на палігонах Расійскай Федэрацыі атрымалі баявыя разлікі (экіпажы) усіх злучэнняў і воінскіх часцей зенітных ракетных войскаў і знішчальных авіяцыйных баз Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Вучэнні з баявымі стрэльбамі з'яўляюцца найважнейшым элементам сістэмы падрыхтоўкі войскаў. На вучэннях не толькі шліфуецца баявая вывучка і практычныя навыкі асабовага саставу, але і фарміруецца псіхалагічная гатоўнасць ваеннаслужачых выконваць задачы ў абставінах, блізкіх да баявых.

Унікальныя падраздзяленні

# ВЯЛІКІЯ АМБІЦЫІ МАЛЕНЬКАГА САМАЛЁТА

## Час — імклівы, ён дыктуе нам свае ўмовы. Галоўнае — не адстаць

**Год таму на месцы базіравання 927-й знішчальнай авіяцыйнай базы быў створаны Цэнтр падрыхтоўкі і прымянення беспілотных авіяцыйных комплексаў (БАК).**



Падпалкоўнік Анатоль Доўжык.

Цэнтру былі перададзены Баявы Сцяг, ганаровая назва і ордэны — для захавання баявых традыцый.

Што мы ведаем пра беспілотныя самалёты? Амаль нічога.

І вось я ў Бярозе — тут на тэрыторыі былой авіябазы знаходзіцца Цэнтр беспілотных авіяцыйных комплексаў. Першым маім суразмоўцам стаў **намеснік камандзіра часці па ідэалагічнай рабоце, маёр Аляксей АНАШАЧКІН.**

*— З 1990-х гадоў сусветная беспілотная авіяцыя пачала бурна развівацца, і сёння прыкладна 30 працэнтаў ваеннай авіяцыі — беспілотная. Самымі буйнымі вытворцамі з'яўляюцца такія краіны, як ЗША і Ізраіль. Беспілотнікі прымяняюцца для разведкі пры правядзенні ваенных аперацый і бываюць стратэгічныя, тактычныя і аператыўныя. Беспілотныя апараты могуць мець самае шырокае выкарыстанне — і не толькі ў войсках. Акрамя гэтага, беспілотнік ва ўтрыманні (абслугоўванні) абыходзіцца намнога танней, а галоўнае, дае магчымасць захаваць лётны састаў.*

**— Немагчыма ў невялікім артыкуле паведаць чытачам усё падрабязна, ды і Цэнтр знаходзіцца яшчэ ў стадыі станаўлення. І ўсё ж цікава, ці ўдзельнічалі ўжо вашы беспілотныя комплексы ў пэўнай аперацыі?**

*— Калі Савет Бяспекі праводзіў праверку Узброеных Сіл Беларусі, наш Цэнтр удзельнічаў у паветранай разведцы і ахове зенітнага ракетнага дывізіёна ад дыверсантаў.*

Хоць Цэнтр і атрымаў абжытую тэрыторыю, але многае там трэба ў парадак. Вядзецца рамонт сталовай, ствараецца музей... Некаторыя памяшканні састарэлі не толькі матэрыяльна, але і маральна. На гэтыя моманты і звярнуў увагу **камандзір часці палкоўнік Уладзімір ПІЛІПЕЦ.**

*— Ад авіяцыйнай базы нам дасталася вялікая інфраструктура, многае састарэла, і цяпер гэта неабходна прывесці прыводзіць у нармальны стан. Вядзецца штодзённая работа па ўладкаванні гарадка. Мяняем пліты на дарогах... Стараемся ўсё зрабіць сваімі сіламі — майстры ёсць.*

**— Уладзімір Уладзіміравіч, праблемы з жыллём, дзіцячымі садкамі... засталіся?**

*— Ёсць падтрымка Міністэрства абароны, і Бярозаўскі райвыканкам не застаецца ўбаку. Усе, хто жадае, можа ўступіць у жыллёвы кааператыў ці нават пабудаваць індывідуальнае жыллё. Падтрымліваем шматдзетныя сем'і матэрыяльна, плануем водпускі на лета, каб у бацькоў была магчымасць з дзецьмі адпачыць... З дзіцячымі садкамі, як і школай, праблем няма.*

**— Цэнтру спаўняецца год — як ні круці, а маленькі юбілей. Ужо ёсць пэўныя напрацоўкі, вызначыліся тыя, хто з'яўляецца сапраўднымі майстрамі сваёй справы?**

*— Можна адзначыць нашых афіцэраў Віктара Каспяровіча і Андрэя Цяцерына. Яны з'яўляюцца настаўнікамі-інструктарамі і першымі асвоілі ўсе тонкасці аператыўнага (аператарскага) майстэрства. У нас добры навукова-інжынерны патэнцыял. Цэнтр працуе ў інтарэсах усіх Узброеных Сіл Беларусі. А сфера прымянення беспілотных комплексаў мае вельмі шырокі спектр, і ён адносіцца не толькі да ваеннай сферы. Напрыклад, беспілотнікі можна прымяняць для выяўлення кантрабандыстаў, лясных пажараў, аховы дзяржаўнай мяжы....*

**— Мы пабывалі ў музеі 927-й авіябазы, які перайшоў Цэнтру ў спадчыну. Ствараецца экспазіцыя, дзе будзе адлюстравана жыццё Цэнтра. І ўсё ж мне здаецца, што беларускае войска ў пэўным сэнсе ўсё яшчэ застаецца там — у Савецкім Саюзе. Вы і афіцэры Цэнтра духоўна яшчэ там ці можна ўжо заявіць, што беларускае войска, у шырокім сэнсе слова, усё ж адбылося? Чым яно адрозніваецца ад Савецкай Арміі?**

*— Ад традыцый мы не адмаўляемся, і Цэнтр наш — кёнігсбергскі чырванасцяжны ордэна А. Неўскага. Але адбылося, на мой погляд, самае важнае. За гэтыя гады мы ўжо «прыкіпелі» да Беларусі — гэта наша Радзіма. І нават афіцэры-расіяне, якія пайшлі ў адстаўку, застаюцца тут, іх дзеці — таксама... У беларускім войску больш парадку, няма тых праблем, што мела Савецкая Армія.*

...А ўжо на аэрадроме, дзе ідзе непасрэдная работа з беспілотнымі комплексамі, невялікае інтэрв'ю даў **старшы афіцэр упраўлення прымянення і развіцця Галоўнага штаба ВПС і ВПА, падпалкоўнік Анатоль ДОЎЖЫК.**

*— У нас ідзе штодзённая вучоба, трэніроўкі, адпрацоўваюцца формы і спосабы прымянення беспілотных апаратаў.*

**— Думаю, чытачам будзе цікава даведацца, якія магчымасці вось у гэтых беспілотнікаў, бо яны, усё ж, на выгляд не вельмі эфектныя. Вось па тэлевізары даводзілася бачыць, якія апараты запускаюць у Ізраілі...**

*— Нашы беспілотнікі расійскай вытворчасці. Яны выкарыстоўваюцца для аператыўнай дзейнасці і маюць адпаведныя паказчыкі: падымаюцца на 3 кіламетры, радыус дзеяння да 35 кіламетраў. Адносна ізраільскіх беспілотных апаратаў, — сапраўды, там гэтай авіяцыі ўдзяляецца вялікая ўвага: жыццё прымушае. Сітуацыя там даволі напружаная. Але ізраільскія беспілотнікі працуюць пры плюсавой тэмпературы, а нашы могуць выкарыстоўвацца пры -25 °С і нават у абледзянелым стане. Як бачым, у нашых апаратаў ёсць свае плюсы.*



Падрыхтоўка да палёту беспілотніка.

Невялікі беспілотнік у небе можна не ўбачыць і не пачуць, ды і збіць яго зусім няпроста. А ўсё, што адбываецца на зямлі за дзясяткі ці сотні кіламетраў, перадаецца імгненна на экран аператару. Сёння беспілотнай авіяцыі адведзена важная роля. Але ці не спазніліся, ці не адсталі мы з развіццём і прымяненнем беспілотных авіякомплексаў? На гэтае пытанне адказаў **начальнік упраўлення ўжывання і развіцця беспілотных авіякомплексаў, палкоўнік Юрый ЛЕАНАВЕЦ.**

*— З'яўленне беспілотных апаратаў — гэта заканамерны этап навукова-тэхнічнага развіцця авіяцыі. Іх шырокае выкарыстанне ва ўзброеных сілах розных краін дыктуецца шэрагам фактараў, асноўным з якіх з'яўляецца захаванне жыцця чалавека. А наконт таго, ці не адсталі мы, скажу: мэтанакіраваная работа ў нашай краіне вядзецца з 2004 года. І ў нас ёсць свае напрацоўкі. Ніхто не адмаўляецца ад закупак імпартнай тэхнікі, але мы ўжо можам ствараць і ў бліжэйшы час будзем ствараць БАК самі. Ёсць спецыяльная дзяржаўная праграма, сродкі выдзелены... Мы ўпэўнены, што неўзабаве Цэнтр будзе аснашчаны больш эфектыўнымі апаратамі беларускай вытворчасці.*

**— Напэўна, існуюць і праблемы?**

*— Існуе праблема допуску беспілотных апаратаў у паветраную прастору. Неабходна прыняць адпаведны Кодэкс, каб мы маглі выкарыстоўваць беспілотнікі больш шырока, а пакуль што яны лятаюць толькі над палігонам.*

**— Юрый Аляксандравіч, хіба Міністэрства абароны не можа вырашыць гэтае пытанне?**

*— Міністэрства абароны з'яўляецца ініцыятарам рашэння гэтага пытання. Існуе паветраная бяспека палётаў, але я ўпэўнены, што неўзабаве беспілотная авіяцыя зойме сваё дастойнае месца. А пакуль што праводзім выпрабаванні і займаемся падрыхтоўкай спецыялістаў. Мы перакананы, што іх наяўнасць дазволіць хутка і якасна вырашыць задачы па прымяненні гэтай перспектыўнай тэхнікі ў нашай краіне.*

**Сымон СВІСТУНОВІЧ,**
**фота аўтара.**

*г. Бяроза.*

# «АЛІМПІЯДА Ў ПАГОНАХ»

## Менавіта так называюць Сусветныя ваенна-спартыўныя гульні, якія традыцыйна праводзяцца раз у 4 гады — за год да Алімпійскіх гульняў

**У ліпені ў Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія) пад эгідай Міжнароднага савета ваеннага спорту адбыліся 5-я Гульні — галоўны спартыўны форум сусветнага ваеннага спорту чатырохгоддзя. Удзел у іх прымалі каля 6 000 спартсменаў са 111 краін свету.**

**Склад беларускай дэлегацыі, якую ўзначаліў старшыня Спартыўнага камітэта Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, палкоўнік Аляксей Мірашнічэнка, быў невялікім: 12 спартсменаў выступілі ў двух відах спорту — лёгкая атлетыка і таэквандо. Аднак які вынік: нашы заваявалі 2 залатыя і 4 бронзавыя медалі.**

**12 спартсменаў-вайскоўцаў — 6 медалёў!**

**Кожны другі спартсмен прывёз на радзіму медаль Гульняў — статыстыка, пагадзіцеся, прыемная.**

**А вось яшчэ досыць красамоўныя лічбы: у неафіцыйным заліку па колькасці заваяваных медалёў Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь занялі 23 месца, а па вартасці медалёў — 17. Сярод дэлегацый краін СНД па колькасці і якасці заваяваных медалёў наша дружына — 3-я.**



Пераможны фініш Марыны Арзамасавай.

Добрая нагода наведаць Спартыўны камітэт Узброеных Сіл краіны! Паколькі мы няшмат ведаем пра Ваенную алімпіяду, папрасіла расказаць аб ёй больш падрабязна **намесніка старшыні Спарткамітэта па ідэалагічнай рабоце Андрэя СУХОГА і афіцэра па інфармацыйна-прапагандысцкай дзейнасці, псіхолага Ганну ЯРМОЛЕНКА.**

Такім чынам, невялічкі экскурс у гісторыю. Пасля Першай сусветнай вайны амерыканскі генерал Джон Першынг — дзеля разбурэння моўных і культурных бар'ераў, умацавання сяброўства паміж салдатамі сіл саюзнікаў — у 1919 годзе стварыў Спартыўны савет саюзных сіл і арганізаваў першыя міжнародныя ваенна-спартыўныя спаборніцтвы ў Францыі. У іх прынялі ўдзел 18 краін з пяці кантынентаў — 1500 спартсменаў па 24 відах спорту.

Пасля Другой сусветнай вайны Спартыўны савет войскаў саюзнікаў быў адроджаны, у 1946 годзе праведзены другія Гульні з удзелам войскаў саюзнікаў у Берліне. Адметна, што саюзнікі з Заходняй і Усходняй Еўропы спаборнічалі на роўных. І ўсё ж па прычыне палітычных рознагалоссяў Спартыўны савет саюзных войскаў у 1947-м быў ануляваны.

Аднак ідэя не была забыта. 18 лютага 1948 года пяццю краінамі (Бельгія, Данія, Францыя, Люксембург, Нідэрланды) быў заснаваны Міжнародны савет ваеннага спорту (CISM). Цяпер ён аб'ядноўвае 133 краіны-ўдзельніцы і з'яўляецца найбуйнейшай спартыўнай арганізацыяй пасля Міжнароднага алімпійскага камітэта і Міжнароднай спартыўнай федэрацыі ўніверсітэтаў. Асноўная задача арганізацыі — наладжванне трывалых сувязяў паміж узброенымі сіламі розных краін у галіне спорту і фізічнага выхавання. Яе дэвіз: «Дружба праз спорт!».

Міжнародны савет ваеннага спорту аб'ядноўвае толькі ваенных спартсменаў, ажыццяўляе дзейнасць у двух накірунках — правядзенне спартыўных спаборніцтваў і распаўсюджванне тэхнічных і навуковых ведаў у галіне спорту. Гэта своеасаблівы інструмент развіцця фізічнай адукацыі моладзі свету і падрыхтоўкі спартсменаў высокага класа, важкі ўклад у справу міру. Штогод праводзяцца міжнародныя сімпозіумы, адукацыйныя семінары, навукова-практычныя канферэнцыі з прадстаўнікамі ўзброеных сіл многіх краін свету.

Міжнародны савет ваеннага спорту мае свой сцяг, герб, гімн, цесна супрацоўнічае з Міжнародным алімпійскім камітэтам, міжнароднымі і нацыянальнымі федэрацыямі, з усімі міжнароднымі спартыўнымі арганізацыямі. Усе спаборніцтвы, якія праводзяцца пад эгідай CISM, узгоднены з календарамі міжнародных федэрацый па відах спорту і праводзяцца на арэнах, якія адпавядаюць міжнародным стандартам. Усё гэта дазваляе спартсменам больш якасна і эфектыўна рыхтавацца да чэмпіянатаў Еўропы, свету і Алімпійскіх гульняў: пераважная большасць спартсменаў Узброеных Сіл выступае за свае нацыянальныя каманды і на грамадзянскіх спаборніцтвах.

У 1993 годзе Рэспубліка Беларусь стала членам Міжнароднага савета ваеннага спорту. За гэты час беларускія вайскоўцы шматлікімі перамогамі і высокімі спартыўнымі дасягненнямі дамагліся заслужанай павагі і прызнання, тым самым умацаваўшы прэстыж нашай дзяржавы і яе Узброеных Сіл на міжнароднай арэне.

З 1995 года, раз у 4 гады, за год да Алімпійскіх гульняў, праводзяцца Сусветныя ваенна-спартыўныя гульні. Беларусы заўжды дэманстравалі добрыя вынікі. Мяркуйце самі:

*1995 год: Рым (Італія) — 5 000 удзельнікаў з 93 краін. Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь у неафіцыйным заліку занялі 33 агульнакаманднае месца.*

*1999 год: Заграб (Харватыя) — 7 000 удзельнікаў з 84 краін. Узброеныя Сілы Беларусі ў неафіцыйным заліку занялі 13 агульнакаманднае месца.*

*2003 год: Катанія (Італія) — каля 6 000 удзельнікаў з 84 краін, беларускія ваенныя спартсмены ў неафіцыйным заліку занялі 7 агульнакаманднае месца.*

*2007 год: Хайдарабад (Індыя) — каля 6 000 спартсменаў са 108 краін свету. Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь заваявалі 2 залатыя медалі, а таксама 10 сярэбраных і 11 бронзавых. У неафіцыйным заліку па колькасці медалёў занялі 6 месца, а па якасці медалёў — 14 месца.*

*Выступленне беларускіх атлетаў у 2011-м было самым якасным за ўсе гады ўдзелу нашай дэлегацыі на Сусветных ваенна-спартыўных гульнях.*

Для капітана каманды лёгкаатлетаў, галоўнага трэнера 2-га аддзела, падпалкоўніка Андрэя Судніка гэта не першая Ваенная алімпіяда, так што ёсць з чым параўноўваць.

**— Андрэй Іванавіч, як праходзіў галоўны старт 4-годдзя для ваенных спартсменаў?**

— Міністэрства спорту і ўзброеныя сілы Бразіліі сумеснымі намаганнямі арганізавалі правядзенне Гульняў на самым высокім узроўні.

Большасць спаборніцтваў праводзілася на спартыўных аб'ектах, якія плануюцца пад правядзенне ў Рыа-дэ-Жанэйра XXXI летніх Алімпійскіх гульняў 2016 года.

**— Адбыўся своеасаблівы папярэдні прагон Алімпіяды — ваенны...**

— Сапраўды, там усё ішло як апрабацыя падрыхтоўкі да будучых алімпійскіх стартаў.

Гульні ў Рыа-дэ-Жанэйра для большасці спартсменаў, якія ўваходзяць у асноўны склад нацыянальных камандаў, і трэнерскага складу з розных краін свету сталі адной з галоўных рэпетыцый да Алімпійскіх гульняў 2012 года ў Лондане. У той жа час маладыя перспектыўныя спартсмены атрымалі неацэнны досвед удзелу ў гэтых прэстыжных міжнародных спаборніцтвах, што, безумоўна, станоўча адаб'ецца на іх далейшым росце.

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***



Трайны скачок Дзмітрыя Платніцкага.

**Любімыя песні вайскоўцаў**

## Наша армія

словы Васіля Жуковіча
музыка Ігара Лучанка



2. Слава продкаў свеціць нам зарой.
Мы шчыты пад гэтым сцягам
Ганарымся Айчыннай славай.
Неўміручаю ратнаю славай!

*Прыпеў:*
Наша армія мір зберагае,
Служыць верна Радзіме яна.
Беларусь нам навек дарагая,
На планеце Айчына адна.

3. Нам прарочыць сонца у высокі
Жыць народу шчасліва, заможна.
Наша армія — гэта народ,
Быць ёй сапраўды непераможнай!

*Прыпеў*

*Рубрыку вядзе Уладзімір ВАРАПАЕЎ, начальнік — мастацкі кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.*

# НОВЫЯ ДЫСКІ АНСАМБЛЯ

Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь працягвае канцэртны тур у рамках героіка-патрыятычнай акцыі «Ніхто не забыты, нішто не забыта». У канцы жніўня ансамбль выступіць з канцэртамі ў Брэсце.

30 жніўня канцэрт пройдзе ў Палацы абласнога грамадска-культурнага цэнтра, дзе будуць прысутнічаць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл, ветэраны вайны ў Афганістане, гараджане. А 31 жніўня ансамбль выступіць у 115-м зенітна-ракетным палку, для падтрымання патрыятычнага духу моладзі.

У ансамблі народжана шмат песень аб абаронцах Брэсцкай крэпасці: «Брэст», «Калі б камні маглі гаварыць» І. Лучанка, «Песня аб Брэсцкай крэпасці» Ул. Алоўнікава і многія іншыя.




На канцэрце ў Брэсце прагучыць песня-рэквіем на словы Л. Воінавай і музыку А. Атрашкевіч «Абаронцам Брэсцкай крэпасці», прэм'ера якой адбылася ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» 22 чэрвеня 2011 года на канцэрце, прысвечаным 70-й гадавіне пачатку вайны.




Значнай падзеяй для ансамбля сёлета стаў выпуск двух дыскаў «Памяць сэрца гаворыць» і «Айчына, табе прысягаю». У першы дыск увайшлі не толькі песні ваенных гадоў з «залатога фонду» ансамбля, але і песні аб вайне, напісаныя ў наш час. Яны займаюць адно з галоўных месцаў у тэматычных канцэртных праграмах ансамбля.

За гэтыя гады шмат песень, якія праслаўляюць нашу Радзіму і нашу армію, народжана ў калектыве, і менавіта яны ўвайшлі ў другі дыск.

Гэтыя песні садзейнічаюць захаванню гістарычнай памяці, выхаванню ў вайскоўцаў, грамадзянскага насельніцтва і падрастаючага пакалення Рэспублікі Беларусь грамадзянскасці і патрыятызму.

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| № лота | Наименование объекта/Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Административно-хозяйственное здание** Одноэтажное кирпичное здание общ. площадью 265,3 кв.м, земельный участок 0,0733 га | 195 959 240 | 19 595 930 |

**Продавец имущества:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Железнодорожного района, адрес объекта: **г. Гомель, пер. Строителей, 3.** Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 08 сентября 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **09 сентября 2011 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5, БИК 153001820, УНП 807000214 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел. 8 0232 75 06 63 (факс), www.bti.by**

# ЁН ВЕДАЎ ВАЙНУ Ў ТВАР

**З кожным годам усё далей адыходзіць ад нас Вялікая Айчынная вайна і ўсё менш застаецца жывых сведак тых трагічных падзей. Кожны франтавік — гэта часцінка нашай гісторыі. Адзін з найстарэйшых ветэранаў сталіцы, падпалкоўнік медыцынскай службы ў адстаўцы Міхаіл Іосіфавіч Коўзусь, адносіцца да той катэгорыі людзей, якія, нягледзячы на сталы ўзрост — 95 гадоў, ні дня не сядзяць без справы. Ён справядліва лічыць, што толькі ў руху цела і думкі можна захаваць здароўе, працаздольнасць і радаснае ўспрыняцце жыцця. І з ім цяжка не пагадзіцца, таму што ўсё яго жыццё — яскравае таму пацвярджэнне.**



Нарадзіўся Міхаіл Іосіфавіч на Палессі ў шматдзетнай сям'і — быў дзясятым дзіцем. Перадваеннае жыццё яго было такім жа, як у многіх людзей яго пакалення, якія жылі ў перыяд, калі вайна змянялася рэвалюцыяй, а рэвалюцыя — новай вайной, калі людзі імкнуліся атрымаць адукацыю, а краіна адчувала недахват у кадрах. Таму пасля школы Міхаіл, не задумваючыся, адправіўся ў Мінскае ваенна-пяхотнае вучылішча.

Аднак стаць курсантам яму не давялося — трох сантыметраў росту не хапіла. Справа ў тым, што ў вучылішча прымалі юнакоў з ростам не менш за метр семдзесят. Грошай на дарогу дамоў не было, ды і жадання вяртацца — таксама. Нядоўга думаючы, разам з сябрам па няшчасці ён адправіўся пехам у Барысаў, дзе ў той час размяшчаўся медыцынскі рабфак.

— Ішлі двое сутак. Калі сілы пакідалі, мы гадзінку-другую паспім у лесе — і далей у дарогу. Да месца прызначэння дабраліся стомленыя, галодныя. Але гэта не перашкодзіла паступіць на рабфак. Пасля заканчэння медыцынскага рабфака старэйшы брат Іван прапанаваў прыехаць да яго у Ленінград. Там (з першага разу!) я паступіў у ваенна-медыцынскае вучылішча, скончыў яго з адзнакай. Сем выпускнікоў, у ліку якіх аказаўся і я, адабралі ў асаблівае распараджэнне народнага камісара абароны, — дзеліцца ўспамінамі ветэран.

Так у 1939 годзе Міхаіл Коўзусь апынуўся ў Манголіі — інструктарам-фельчарам асобнага артдывізіёна 1-ай кавалерыйскай дывізіі.

**— Наколькі складанай была праца ваеннага фельчара?**

— «Все лето кровь не сохла на руках. С утра рубили, резали, сшивали. Не сняв сапог, на куцых тюфяках дремали два часа, и то едвали». Гэтыя радкі прысвяціў працы ваенных медыкаў на Халхін-Голе паэт Канстанцін Сіманаў... Мы былі маладыя хлопцы, вопыту і ведаў не хапала, і вучыліся мы па-сапраўднаму, як, зрэшты, і астатнія франтавыя медыкі, на крыві і на сваіх памылках. А наогул гарачыя мангольскія стэпы, падзеі на Халхін-Голе пакінулі ў маёй памяці глыбокі след. Мы напружана працавалі дні і ночы, ратуючы жыцці савецкіх і мангольскіх воінаў. Там, на Халхін-Голе, я атрымаў першы ордэн — Чырвонай Зоркі.



Вырабы з калекцыі Міхаіла Коўзуся.

Дарэчы, другі ордэн Міхаіл Іосіфавіч атрымаў за ўдзел у баях з самураямі ў 1945 годзе — ён у той час служыў начальнікам санітарнай службы асобнага знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна 39-ай асобнай стралковай дывізіі.

Медыкі на вайне выконвалі сваю галоўную задачу — ратавалі жыцці сваіх таварышаў. А гэта значыць — заўсёды знаходзіліся на перадавой. Дзяржава высока ацаніла заслугі Міхаіла Коўзуся. На яго грудзях — ордэн Айчыннай вайны, медалі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй» і іншыя.

У 1949 годзе капітан медыцынскай службы Міхаіл Коўзусь прыбыў для далейшага праходжання ваеннай службы ў Беларускую ваенную акругу на пасаду старшага фельчара батальёна 336-га гвардзейскага стралковага палка 120-ай гвардзейскай стралковай Рагачоўскай дывізіі.

— Аднойчы наш батальён вяртаўся з чарговых вучэнняў. Усё прайшло на дастаткова высокім узроўні, усе задачы асабовы склад выканаў, ніякіх няштатных сітуацый не ўзнікала, — успамінае ветэран. — Мне як фельчару не давялося нават бінт з ёдам з санітарнай сумкі даставаць. Трэба сказаць, што ў тыя часы выкананню патрабаванняў бяспекі надавалася вялікая ўвага. Калі мы прыбылі ў пункт пастаяннай дыслакацыі, асабовы склад стаў выгружацца з машын, і строіцца. І тут адзін з ваеннаслужачых выкідае наперад сваю зброю, а пасля скача... Раздаўся стрэл. Я паімчаўся да салдата, молячы бога толькі аб тым, каб стрэл трапіў хоць бы ў плячо. Аднак усё аказалася больш сур'ёзна — байцу разнесла грудзі. Зразумела, за час вайны я бачыў і не такіх параненых, але адна справа — вайна, а зусім іншая — мірнае жыццё. Аказаўшы пацярпеламу першую медыцынскую дапамогу, адправіў яго ў шпіталь. Цяпер ужо і не памятаю, выжыў ён ці не, але выпадак гэты застаўся ў памяці і да гэтага дня.

У 120-ай гвардзейскай стралковай дывізіі капітан Міхаіл Коўзусь праслужыў дзевяць гадоў. Быў ён і начальнікам абозна-рэчавай службы 869-га артылерыйскага палка, і начальнікам рэчавага забеспячэння 310-га гвардзейскага артылерыйскага палка. Скончыў ваенную службу падпалкоўнік медыцынскай службы ў адстаўцы Міхаіл Коўзусь намеснікам камандзіра па забеспячэнні 724-га ваенна-будаўнічага атрада, але медыцынскія навыкі за гэтыя гады не страціў. Пастаянна займаўся самаадукацыяй, шмат чытаў. Пасля выхаду на пенсію амаль дваццаць гадоў Міхаіл Іосіфавіч прапрацаваў у санэпідстанцыі. Добрасумленны і граматны афіцэр і ў цывільным жыцці быў добрым работнікам і спецыялістам высокага класа. А галоўнае, заўсёды заставаўся Чалавекам з вялікай літары.



Псіхолагі сцвярджаюць, што нішто так не амаладжвае, як цікавая праца або захапленне. Людзі, якія займаюцца любімай справай, выглядаюць маладзей. Герой майго расказу — яркае таму пацвярджэнне. Яшчэ ў дзяцінстве маленькі Міша бегаў з дзятвой у лес і збіраў лазу, кару розных дрэў для пляцення. І вось ужо на працягу васьмі дзясяткаў гадоў гэтае захапленне з'яўляецца для яго любімым заняткам. Грыбныя кошыкі, гаспадарчыя кашы, лапці — гэта далёка не поўны пералік вырабаў з калекцыі Міхаіла Коўзуся.

**— Шмат часу ідзе на выраб, напрыклад, кошыка?** — пытаюся ў майстра.

— Калі не ўлічваць нарыхтоўку матэрыялу, не. Але для пачатку трэба рассартаваць пруткі. Яны павінны быць аднолькавай даўжыні, каб пасля не прыплятаць кавалачкі ці не адразаць лішняе і непсаваць доўгі прут. Я, напрыклад, адразу бачу, ці хопіць мне трыццацісантыметровага прутка, каб скончыць выраб, ці трэба паўмятровы браць, — раскрывае сакрэты майстэрства народны ўмелец. — А ўвогуле няважна, чым захоплены чалавек, галоўнае ў тым, ці ёсць у яго адчуванне поспеху, карыснасці сваёй справы, ці прыносіць яму задавальненне яго праца. Калі гэта так, то ў чалавека свецяцца вочы, ён выглядае энергічным. Захапленне — гэта лячэнне, якое дапамагае доўга жыць.

На маё пытанне, у чым сакрэт даўгалецця, Міхаіл Іосіфавіч адказаў так:

— Сакрэтаў у мяне ніякіх няма, але ёсць правіла. Я заўсёды стараўся весці здаровы лад жыцця, правільна харчавацца. І сёння ў свае 95 гадоў прачынаюся ў шэсць раніцы, гадзіну займаюся гімнастыкай. Да таго ж штодня раблю дзве прагулкі, прычым у любое надвор'е. Я ўсё жыццё жыў не для сябе, а для людзей, стараўся кожнаму дапамагчы. У мяне няма ворагаў і зайздроснікаў. Я заўсёды стаўлюся да людзей так, як хацеў бы, каб яны ставіліся да мяне. Таму Гасподзь літасцівы да мяне, дае здароўе і сілы.

**Алена ЗАЦІРКА,**
**ваеннае інфармацыйнае агенцтва «Ваяр».**
**Фота Мікалая ЛЯБЕДЗІКА.**

## Выкананне міжнародных дагавораў у галіне кантролю над узбраеннямі

З 29 жніўня па 9 верасня 2011 года на базе Нацыянальнага агенцтва па кантролі і інспекцыях дэпартамента Міністэрства абароны будзе праведзены курс па выкананні міжнародных дагавораў у галіне кантролю над узбраеннямі для прадстаўнікоў верыфікацыйных цэнтраў дзяржаў-удзельніц НАТА і АБСЕ.

У мерапрыемстве прымуць удзел 16 прадстаўнікоў верыфікацыйных цэнтраў Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Італіі, Казахстана, Літвы, Польшчы, ЗША, Чэхіі.

## У ВАЕННАЙ АКАДЭМІІ ПРОЙДЗЕ ЎРАЧЫСТАЯ ЦЫРЫМОНІЯ ПРЫНЯЦЦЯ ВАЕННАЙ ПРЫСЯГІ

### на вернасць народу Рэспублікі Беларусь курсантамі набору 2011 года

**3 ВЕРАСНЯ 2011 года ў Ваеннай акадэміі пройдзе ўрачыстая цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі на вернасць народу Рэспублікі Беларусь курсантамі набору 2011 года.**

Сёлета ў галоўную ваенную ВНУ краіны залічана 539 чалавек. З абітурыентаў, якія паступілі ў Ваенную акадэмію, 10 чалавек залічаны без уступных выпрабаванняў (выпускнікі МСВВ), 23 залічаны па-за конкурсам, з якіх 12 — гэта дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, 11 — ваеннаслужачыя, якія маюць рэкамендацыі воінскіх часцей.

Ваенная акадэмія праводзіць падрыхтоўку афіцэраў і для іншых сілавых ведамстваў. У інтарэсах унутраных войскаў сёлета пачнуць навучанне 45 курсантаў, у інтарэсах Дзяржаўнага пагранічнага камітэта — 16, КДБ — 11, МНС — 4.

Прахадныя балы ў абітурыентаў пры паступленні ў Ваенную акадэмію ў 2011 годзе склалі ад 114 да 327 балаў.

## У адпаведнасці з палажэннямі Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе

### ПРЫБЫЛА ІНСПЕКЦЫЙНАЯ ГРУПА ФЕДЭРАТЫЎНАЙ РЭСПУБЛІКІ ГЕРМАНІЯ

**23 жніўня ў Рэспубліку Беларусь прыбыла інспекцыйная група Федэратыўнай Рэспублікі Германія пад кіраўніцтвам палкоўніка Міхаэля Шута.**

У адпаведнасці з палажэннямі Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, падчас інспекцыі праверана адна з воінскіх часцей Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, якая з'яўляецца аб'ектам кантролю.

Мэта інспекцыі — праверка адпаведнасці наяўнасці ўзбраення і ваеннай тэхнікі, якія абмяжоўваюцца Дагаворам, іх заяўленай колькасці.

У складзе інспекцыйнай групы, акрамя сямі ваенных інспектараў Германіі, — па адным інспектару з Вялікабрытаніі і Польшчы.

**Открытое акционерное общество «Фабрика «Березка»**

**ОТКАЗЫВАЕТСЯ ОТ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ СКЛАДА (инв. № 630/С-65854)**
общей площадью 363,2 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, д. 12, корп. 1, который планировался к проведению 06.09.2011 г.

**Телефон и адрес для справок: (80176) 772402; 222310, г. Молодечно, ул. Виленская, 12.**

УНП 600136873

# «АЛІМПІЯДА Ў ПАГОНАХ»



**У мінскім аэрапорце сустракаюць пераможцаў: «залатая» Аліна Талай.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

**— Ці задаволены выступленнем каманды?**

— Заўсёды, як вядома, хочацца лепш, хутчэй, вышэй!

**— Тым не менш, вынікі беларусаў уражваюць.**

— У спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы прынялі ўдзел каля 700 спартсменаў з 81 краіны свету. Беларусы прымалі ўдзел у 8 з 35 прадстаўленых на гульнях дысцыплінах. У суперніцтве з вядомымі спартсменамі нашы атлеты заваявалі 5 медалёў.

Малодшы сяржант кантрактнай службы Марына Арзамасава заваявала залаты медаль у бегу на 800 метраў.

Старшына кантрактнай службы Аліна Талай узяла «золата» на дыстанцыі 100 метраў з бар'ерамі.

У радавой кантрактнай службы Кацярыны Паплаўскай — «бронза» на дыстанцыі 100 метраў з бар'ерамі, у прапаршчыка Андрэя Сінякова — бронзавы медаль у штурханні ядра, а ў старшага сяржанта кантрактнай службы Дзмітрыя Дзецука — у трайным скачку.

Літаральна за некалькі крокаў ад п'едэстала апынуліся радавыя кантрактнай службы Наталля Вяткіна і малодшы сяржант Ксенія Дзяцук (адпаведна 4 і 6 радкі пратакола, трайны скачок), радавы Дзмітрый Платніцкі (5 месца, трайны скачок), спартсмен-інструктар 2-га аддзела Юлія Балыкіна (5 месца, дыстанцыя 100 метраў), прапаршчык Арцём Зайцаў (6 месца, скачкі ў вышыню), старшы сяржант кантрактнай службы Сяргей Рагонаў (8 радок фінішнага пратакола, кіданне дыска).

**— У спаборніцтвах па таэквандо ад Беларусі ўдзельнічала адзіная прадстаўніца, Вікторыя Беланоўская, — яна прывезла на радзіму бронзавы медаль.**

— У гэтым відзе спорту прынялі ўдзел больш за 230 спартсменаў з 33 краін свету. Спаборніцтвы праходзілі ў 16 вагавых катэгорыях. Наша Вікторыя Беланоўская заваявала бронзавы медаль у катэгорыі 67 кг. Варта адзначыць, што спаборніцтвы па таэквандо з'яўляліся кваліфікацыйнымі да Алімпійскіх гульняў 2012 года ў Лондане, і Вікторыя набрала рэйтынгавыя ачкі.

**— Цікава, на цырымонію адкрыцця Гульняў спартсмены выходзяць у ваеннай форме або ў спартыўнай?**

— Усе — у ваеннай форме сваіх краін. На вялікі жаль, стадыён не пабачыў парадднай ваеннай формы нашай дзяржавы: неспадзяваны форс-мажор... Наша дэлегацыя на парад-адкрыццё не паспела з-за таго, што кампанія Air France кардынальна змяніла час вылету ў Рыа-дэ-Жанэйра. А адлегласць жа немалая, з Парыжа 11 гадзін лёту...

**— А якім было закрыццё Гульняў?**

— Арганізатары прынялі рашэнне, што на цырымоніі закрыцця ўдзельнікі будуць у нацыянальных спартыўных касцюмах. Закрыццё праходзіла ў дастаткова дэмакратычнай форме. Сцягі дзяржаў-удзельніц Гульняў выносіліся, як заўжды, у алфавітным парадку — а ўсе спартсмены выйшлі адным суцэльным патокам.

**— Гэта таксама сімвалічна: ваенныя спартсмены — усе разам.**

— Безумоўна. Усе разам слухалі выступленне старшыні CISM, глядзелі салют...

**— А дзе жылі спартсмены?**

— У алімпійскай вёсцы. Там, дарэчы, ужо пабудаваны тры алімпійскія вёскі: белая, блакітная і зялёная.

**— Да 2016 года часу нямала, але ва ўсю моц ідзе падрыхтоўка да Алімпіяды!**

— Так. Новыя, толькі-толькі здадзеныя будынкі. Многае яшчэ не наладжана, штосьці недаробленa. Але, тым не менш, усё функцыянуе. Праўда, стадыён ад алімпійскай вёскі знаходзіцца на дастаткова вялікай адлегласці, ехаць даводзілася ад 40 хвілін да гадзіны.

...Гэта ўжо мая чацвёртая Ваенная алімпіяда, спачатку ездзіў як спартсмен, потым — як трэнер. Паўсюль арганізатары па-рознаму, у меру сваіх магчымасцяў, размяшчаюць спартсменаў. У Індыі, напрыклад, жылі ў казармах ваеннай навучальнай установы. У Італіі — у атэлі. Зусім іншая атмасфера.

**— Кожны другі беларускі спартсмен заваяваў медаль на гульнях...**

— Гэта сведчыць аб росце якасці падрыхтоўкі армейскіх спартсменаў. У нас увогуле вельмі шмат вайскоўцаў-спартсменаў высокага ўзроўню, але склад каманды быў мінімальны ў сувязі з абмежаванасцю фінансавых сродкаў.

Годнае выступленне нашай дэлегацыі стане арыенцірам у працы трэнерскага складу па падрыхтоўцы спартсменаў Узброеных Сіл да будучых стартаў і да 6-х Сусветных ваенна-спартыўных гульняў, якія адбудуцца ў 2015 годзе ў Паўднёвай Карэі.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**
**Фота Андрэя СУХОГА і з сайта: www.rio2011.mil.br**

**Бронзавы прызёр Дзмітрый Дзяцук.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

Аукцион состоится **22 сентября 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8(0222)229022, 311185, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лотам №№ 1, 2 и 3 – РУП «Могилевское отделение Белорусской железной дороги», тел.: 8(0222)392665; по лоту № 4 – ГУ «Бобруйское ЭУ ВС», тел. 8(0225)481011.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **20 сентября 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **22 сентября 2011 г.** с 10.00 до 10.50.

| № лота | Сведения о предметах аукциона | | | | | | | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о недвижимом имуществе | | | Информация о земельных участках | | | Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб. | |
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб. | Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. | | |
| 1 | Здание товарной конторы с двумя тамбурами, одноэтажное кирпичное 1115,3 кв.м | Могилевская область, г. Костюковичи, ул. Кулешова, д. 13Б | 33 863,149 | 0,0450 | 50 | 2 925,888 | 36 789,037 | 3 000,0 |
| 2 | Здание красного уголка одноэтажное, кирпичное 148,09 кв.м | Могилевская область, г. Климовичи, ул. Железнодорожная, 1б | 36 870,808 | 0,0219 | 15 | 185,728 | 37 056,536 | 3 000,0 |
| 3 | Здание нежилое с тамбуром и тремя крыльцами, одноэтажное, кирпичное 275,5 кв.м | Могилевская область, Быховский район, Борколабовский с/с, о.п. Борколабово, 1 | 76 416,122 | 0,1593 | 40 | 13,020 | 76 429,142 | 7 000,0 |
| 4 | Зубопротезная лаборатория, одноэтажная, кирпичная 106,3 кв.м; тепловая сеть 27,3 м.п.; водопроводная сеть 3,9 м.п.; канализационная сеть 9,5 м.п.; кабельная линия 299 м.п. | Могилевская область, Могилевский район, Буйничский с/с, снп. Голынец | 26 179,667 | 0,0296 | 10 | 228,190 | 26 407,857 | 2 000,0 |

Недвижимое имущество, входящее в состав лота № 2 обременено арендой, площадью 32,52 кв.м до 31 июля 2012 г.

Условие для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договоров аренды которых входит в состав:

- лота № 3 – в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Быховского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет;

- лота № 4 – в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Могилевского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 24 июня 2011 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

# У госці да БАТЭ прыедуць «Барселона» і «Мілан»

**Да вынікаў лёсавання ў групавым раўндзе Лігі чэмпіёнаў можна ставіцца па-рознаму. «Барселона», «Мілан» і чэшская «Вікторыя» — гэта, зразумела, «група смерці». А з іншага боку, пра такіх грандаў можна толькі марыць! Яшчэ свежыя ў памяці ўспаміны пра восень 2008-га, калі ў Мінск прыязджалі «Рэал», «Ювентус» і «Зеніт». Гэта і вар'яцкія чэргі па білеты, якія займалі з 6 раніцы, і ні з чым не параўнальны антураж перад матчам, і экстаз перапоўненага стадыёна, калі каманда забівае гол. Мы памятаем, якімі акрыленымі былі нашы мары, калі БАТЭ вяло 2:0 пасля першага тайма з «Ювентусам», і слёзы расчаравання ад нічыёй... Усё гэта сёлета нам давядзецца перажыць зноў...**

Ужо праз месяц, 28 верасня мы ўбачым «Барселону». Яна першай завітае ў госці да БАТЭ. Месі, Ін'еста, Вілья, Фабрэгас, Хасэп Гвардыёла, нарэшце, — можна не сумнявацца ў аншлагу на стадыёне «Дынама» і прыкідваць, наколькі спадабаецца гэтым спешчаным іспанцам наша суровае надвор'е і газон... Увогуле ж, згуляць супраць дзейнага ўладальніка кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў марыць бадай любая каманда. 4 разы клуб з Каталоніі становіўся наймацнейшым у Еўропе, апошнія разы гэта было ў 2006-м, 2009-м, і 2011-м.

Яшчэ адзін гранд — чэмпіён Італіі «Мілан», які сем разоў выйграваў Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. Гатуза, Індзагі, Замброта... Ім таксама наўрад ці спадабаецца наша надвор'е — «Мілан» прыязджае ў «Мінск» 1 лістапада, але гарачы прыём на стадыёне «Дынама» таксама гарантаваны.

А ў якасці размінкі будзе чэшская «Вікторыя». Клуб не такі вядомы, але ўвагі і павагі, несумненна, варты. Чэхі прыедуць у Беларусь на старце турніру, ужо 13 верасня.

Відаць, у дортмундскай «Барусіяй». Там, як і ў Барселоне з Міланам, вялізны стадыён, заўсёды запоўнены пад завязку. Гуляць пры аўдыторыі ў 70 тысяч чалавек — гэта вялізны досвед. Безумоўна, галоўным у маёй трэнерскай кар'еры будзе матч з «Барселонай». Многія трэнеры імкнуцца раскусіць гэты клуб, але толькі лічаным могуць яму штосьці супрацьпаставіць. Хуткасць прыняцця рашэнняў, работа з мячом, выкананне — гэта прысутнічае ў дружыне з Каталоніі проста на касмічным узроўні. Для каманды, для нас, трэнераў, гэта будзе бясцэнны досвед. Паспрабуем зрабіць тое, што не ўдаецца нават «Рэалу» і «Манчэстэру».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**Расклад матчаў у групе Н:**

**1-шы тур 13 верасня (аўторак).** «Вікторыя» — БАТЭ, «Барселона» — «Мілан».

**2-гі тур 28 верасня (серада).** БАТЭ — «Барселона», «Мілан» — «Вікторыя».

**3-ці тур 19 кастрычніка (серада).** «Мілан» — БАТЭ, «Барселона» — «Вікторыя».

**4-ты тур 1 лістапада (аўторак).** БАТЭ — «Мілан», «Вікторыя» — «Барселона».

**5-ты тур 23 лістапада (серада).** БАТЭ — «Вікторыя», «Мілан» — «Барселона».

**6-ты тур 6 снежня (аўторак).** «Барселона» — БАТЭ, «Вікторыя» — «Мілан».

**Віктар ГАНЧАРЭНКА:**

**«Паспрабуем зрабіць тое, што не ўдаецца «Рэалу» і «МЮ»**

Галоўны трэнер БАТЭ, які напярэдадні дзяліўся, што хацеў бы атрымаць у супернікі прадстаўніка прэм'ер-лігі «Манчэстэр», «Барселонай» не расчараваны:

— Не раз казаў, што хацеў бы сустрэцца менавіта з «МЮ», паколькі люблю гэту каманду. Але незадавальнення ад лёсавання, зразумела, няма. «Барселона» гуляе ў эталонны футбол, з'яўляецца паўнамоцным уладальнікам трафея. «Мілану» таксама рэкамендацыі не патрэбны. Падсвядома пачынаеш думаць, як супрацьстаяць грандам еўрапейскага футбола, колькі ачкоў можаш набраць у групе... Але скажу так, што на стадыёне «Дынама» мы здольныя аказаць сур'ёзны ціск на любога суперніка. Да таго ж у каманды зараз іншая мэта — мы яшчэ не атрымлівалі перамог у групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў. Перад тым, як у нашай групе аказалася чэшская «Вікторыя», хацелася згуляць з дортмундскай «Барусіяй»...

**А вось што думаюць пра вынікі лёсавання гульцы БАТЭ.**

**Філіп РУДЗІК:**

**З «Барселонай» спачатку хаця б давесці мяч да іх паловы поля»**

— Гэта тое, што трэба! Я хацеў «Барселону». Хлопцы з Наваполацка цяпер мне павінны. Мае сябры папрасілі, каб я прывёз да іх «сіне-гранатавых». Калі ласка! Хваляваўся, калі засталося два шарыкі. Хацеў, каб Гуліт выцягнуў нас апошнімі. Пашчасціла, што так і атрымалася. Хадзіў з гэтай думкай яшчэ да гульні са «Штурмам», жадаў гэту «Барселону». Я проста ніколі іншапланецян не бачыў ужывую. Там жа ўсе такія. Прыляцяць у Беларусь на талерцы і паляцяць назад. А што датычыць «Вікторыі», то таксама няпросты супернік. «Капенгаген» жа яны неяк выбілі. Але ў нас ёсць Марка Сіміч. Ці заб'е ён «Барселоне»? Спачатку трэба неяк давесці мяч да іх паловы поля, а там паглядзім. Мы з хлопцамі прыдумалі тактыку: будзем біць у аўт, і далей ужо як пойдзе», — цытуе Рудзіка «Прессбол».

**Дзмітрый БАГА:**

**«Цікава адчуць, як гуляць супраць «Барселоны»**

— Усе хочуць убачыць «МЮ», «Барселону» і «Мілан». У гэтым плане для нас група вельмі добрая, і нам самім цікава. Канешне, будзе вельмі цяжка. Але гэта адны з лепшых камандаў свету, а «Барселона» — найлепшая. Цікава паглядзець і адчуць, як з імі гуляць. Усё роўна будзем старацца, нягледзячы на тое, што ў нас такія зоркі ў групе. Упэўнены, што дома будуць поўныя трыбуны, і мы пастараемся набраць ачкі.

**Анатоль КАПСКІ:**

**«10 адсоткаў прызавых вырашылі аддаць»**

Тым часам Анатоль Капскі расказаў, як будзе патрачана частка сродкаў, выручаных ад выхаду ў групавы турнір. Нагадаем, што ад УЕФА клуб атрымае 3,8 мільёна еўра. Акрамя таго, за ўдзел у матчах групавой стадыі — 7,1 мільёна. А калі ўдасца атрымаць нічыю ці перамогу — яшчэ па 400 і 800 тысяч адпаведна.

— Мы разам з хлопцамі прынялі рашэнне: больш 10 адсоткаў сумы прызавых перададзім тым, каму хочам дапамагчы. У Барысаўскім раёне ў вёсцы Зэмбін мой сябар-бізнэсмен адраджае царкву, разбураную яшчэ за савецкім часам. Там здымаўся фільм пра вайну, у яе заязджалі на танках... У нас яшчэ ёсць наша барысаўская дзяўчынка, яна для нас родная. У яе складанае захворванне, і мы вырашылі, што аплацім ёй аперацыю за мяжой. Калі табе Бог штосьці дае, трэба падзяліцца з іншымі людзьмі. Калі табе добра, трэба, каб добра было ўсім.

## ВАЛЮТЧЫК З КАНФІСКАЦЫЯЙ

**У Магілёве падчас незаконнага абмену валюты затрыманы 44-гадовы мужчына, у якога канфіскавалі больш за 200 мільёнаў рублёў, у пераразліку на беларускія грошы.**

Упраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці сумесна з упраўленнем па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю Магілёўскага УУС затрымалі валютчыка, падчас абмену 75 тысяч расійскіх рублёў на 20,6 мільёна беларускіх рублёў.

У інфармацыі УДФР гаворыцца, што гэты мужчына нідзе не працаваў працяглы час, але «прафесійна» займаўся незаконнымі набыццём, продажам і абменам валюты. Яго паслугамі карысталіся не толькі выпадковыя грамадзяне, якія шукалі больш выгадныя курсы, але і пастаянныя кліенты — прадпрымальнікі і прадстаўнікі камерцыйных структур.

Толькі на момант затрымання ў валютчыка знайшлі і канфіскавалі 18 750 долараў ЗША, 6 110 еўра, 174 610 расійскіх рублёў, 11,2 мільёна беларускіх рублёў. Агульная сума ў беларускіх грошах — 201,5 мільёна рублёў. Цяпер УДФР вырашае пытанне аб распачынанні супраць яго крымінальнай справы за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

І яшчэ раз праваахоўнікі нагадваюць, што за незаконны абмен караюцца не толькі валютчыкі, але і іх кліенты. Ім пагражае канфіскацыя валюты і штраф да сотні базавых велічынь, і гэта ў дадатак да небяспекі набыць з рук махляроў фальшывыя грошы.

**Ілона ІВАНОВА.**

Актуальна

# ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ ВЫЗНАЧАЕЦЦА НЕ ТОЛЬКІ ГЛЫБІНЁЙ І ДАКЛАДНАСЦЮ ВЕДАЎ...

**Ці хочаце вы, каб у дзіцячым садку выхаваннем вашых дзетак займаліся настаўнікі гісторыі, замежных моў, філолагі або ўвогуле людзі без педагагічнай адукацыі, напрыклад, дыпламаваныя юрысты або выпускнікі эканамічных спецыяльнасцяў? Аднак факт застаецца фактам: запоўніць усе вакансіі ў сталічных дзіцячых садках выпускнікамі факультэта дашкольнай адукацыі не ўдаецца ўжо не першы год. У Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка, які адказвае за насычэнне сталіцы педагагічнымі кадрамі, ідуць вучыцца пераважна жыхары з іншых рэгіёнаў краіны, і з-за адсутнасці ў іх пастаяннай сталічнай рэгістрацыі маладых спецыялістаў немагчыма размеркаваць у Мінск. Патрэбы сталіцы задавальняюцца педагагічным універсітэтам толькі прыкладна на 10 працэнтаў. Увогуле сёння стала звычайнай практыкай прыцягваць да работы ў дашкольных установах студэнтаў старэйшых курсаў і работнікаў, якія не маюць профільнай сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а сумяшчаюць працу з навучаннем у ВНУ. Для прыкладу, у Першамайскім раёне сталіцы толькі 57 працэнтаў выхавальнікаў у дзіцячых садках маюць профільную адукацыю. Усё гэта сведчыць толькі пра адно: без істотнага павышэння статусу работніка ўстановы дашкольнай адукацыі кадравыя праблемы ў гэтай сферы ніколі не вырашыць. І гэта толькі адна з праблем, што ўзнімаліся на гарадскім форуме педагагічных работнікаў сталічных устаноў адукацыі.**

**Старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Уладзімір ШЧЭРБА** паведаміў, што паказчык ахопу ў сталіцы дзяцей дашкольнай адукацыяй самы высокі ў краіне — дзіцячыя садкі наведваюць 93 працэнта дзяцей. Вельмі запатрабаванымі з боку бацькоў з'яўляюцца групы з кароткачасовым знаходжаннем дзяцей — усяго ў горадзе адкрыта 169 такіх груп (адаптацыйных, аздараўленчых і выхаднога дня). За 5 апошніх гадоў у горадзе было ўведзена ў эксплуатацыю 19 новых дзіцячых садкоў. Асабліва інтэнсіўна яны будаваліся ў 2009-м і 2010-м гадах, калі ў горадзе адкрылася 10 дзіцячых садкоў на 2045 месцаў. Зараз будуецца яшчэ 6 садкоў. Восенню адкрыецца доўгачаканы сад у мікрараёне «Каменная Горка-5». Нягледзячы на пэўныя эканамічныя цяжкасці, ніводная будоўля не замарожваецца. І ўсё ж такі 60 працэнтаў дашкольных устаноў працуюць у горадзе з перагрузкай. А для новых мікрараёнаў праблема забяспечанасці месцамі ў дашкольных установах па-ранейшаму не страчвае актуальнасці. Часткова праблема дэфіцыту месцаў вырашаецца за кошт вывядзення першых класаў з дзіцячых садкоў у школы. Калі ў 2005 годзе на базе дзіцячых садкоў навучаліся 74 працэнты першакласнікаў, то ў 2011 годзе — толькі 31 працэнт.

## Кожны пяты вучань — гімназіст

У новым навучальным годзе ў Мінску адкрыюцца таксама 2 новыя школы — у Маскоўскім і Фрунзенскім раёнах сталіцы.

— Усё больш запатрабаванай становіцца ў горадзе гімназічная адукацыя, якая займае лідзіруючыя пазіцыі ў пытаннях якасці адукацыі, — падкрэсліў у сваім выступленні Уладзімір Шчэрба. — У папярэднім навучальным годзе ў сталіцы з'явіліся дзве новыя гімназіі. У новым навучальным годзе статус гімназіі атрымаюць яшчэ тры школы. Такім чынам, у Мінску будзе дзейнічаць ужо 45 гімназій, 2 ліцэі і адзін вучэбны комплекс «гімназія—каледж». Фактычна гімназічнай адукацыяй ахоплена ўжо пятая частка мінчан школьнага ўзросту. Разам з тым аналіз размяшчэння гімназій на карце горада паказвае, што не ва ўсіх сталічных раёнах створаны роўныя ўмовы для атрымання маленькімі мінчанамі гімназічнай адукацыі. Напрыклад, у Ленінскім раёне ўсе гімназіі і Ліцэй №2 размешчаны ў мікрараёне «Серабранка». А ёсць яшчэ і мікрараён «Лошыца», і раён камвольнага камбіната. Затое ў Цэнтральным раёне сталіцы ўжо фактычна падыходзяць да ўсеагульнай гімназічнай адукацыі: гімназій там больш, чым звычайных школ. Лічу, што адміністрацыям раёнаў, перш чым выходзіць з хадайніцтвам аб адкрыцці чарговай гімназіі, трэба ўлічваць інтарэсы ўсяго насельніцтва, у тым ліку і жыхароў аддаленых мікрараёнаў.

Уладзімір Шчэрба не стаў таксама хаваць сваёй трывогі за выкананне дзяржаўнага заказу па авалоданні выпускнікамі школ гутарковай замежнай мовай:

— Літаральна з першых дзён навучальнага года мы перайшлі на новыя ўмовы навучання замежным мовам. І сёння ўжо можна меркаваць аб агульнай карціне. Аналіз паказаў, што ў большасці ўстаноў (а гэта 73 працэнты школ і гімназій) былі выкананыя нарматыўныя патрабаванні па дзяленні класаў на падгрупы. Сярэдняя іх напаўняльнасць была 7 вучняў. Разам з тым чацвёртая частка класаў была падзелена толькі на дзве падгрупы, і колькасць навучэнцаў у іх складала 11-12 чалавек. І справа не толькі ў аб'ектыўных прычынах. Даволі часта гэта было наступствам недапрацоўкі кіраўнікоў установы адукацыі, якія не прыцягнулі ўсе магчымыя рэсурсы для выканання новых патрабаванняў.

Уладзімір Шчэрба падкрэсліў, што толькі наяўнасць высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя зусім не гарантуе высокую якасць навучання. Усе мінскія школы маюць лінгафонныя кабінеты новага пакалення, электронныя сродкі навучання, аднак іх магчымасці не выкарыстоўваюцца на поўную моц. Не ўсе кабінеты замежнай мовы маюць выхад у інтэрнэт, хоць інтэрнэт-асяроддзе пры разумным яго выкарыстанні магло бы паспрыяць фарміраванню моўных навыкаў у школьнікаў.

— Праз два гады адзінаццацікласнікі ўпершыню будуць здаваць абавязковы дзяржаўны экзамен па замежнай мове, дзе будуць дэманстраваць рэальныя вынікі навучання замежным мовам. І гэты экзамен разам з імі будзем трымаць і мы — настаўнікі і кіраўнікі, — дадаў Уладзімір Шчэрба.

## Дзеці — не аб'екты для выхавання

Асобная тэма — якасць выхаваўчай работы.

— Мы заўсёды з гонарам прыводзілі лічбы прыросту членаў моладзевых грамадскіх арганізацый і лічылі іх паказчыкам якасці выхаваўчай работы. Але ёсць і іншая праўда: падлеткі не хочуць уступаць у грамадскія арганізацыя з-за жорсткага кіраўніцтва з боку педагогаў, састарэлых формаў працы, арыентаванасці гэтых аб'яднанняў толькі на вучэбна-выхаваўчыя мэты. Па звестках сацыялагічнага апытання, найбольшую цікавасць падлеткі праяўляюць да моладзевых структур спартыўнай і культурнай накіраванасці. Амаль трэць удзельнікаў апытання не цікавяцца дзейнасцю моладзевых арганізацый. Дзясятая частка лічыць, што ў большасці з іх работа вядзецца толькі «для галачкі». І значная частка маладых людзей упэўненыя, што моладзевыя арганізацыі не іграюць ніякай ролі, — паведаміў Уладзімір Шчэрба. — Лічу, што нам, дарослым, трэба мець на ўвазе, што старымі формамі і метадамі сітуацыю змяніць не ўдасца. Моладзь ужо іншая, і дзеці ніколі не пагодзяцца быць проста аб'ектамі для выхавання. А пакуль даводзіцца канстатаваць няўменне ці нежаданне улічваць у працы з падрастаючым пакаленнем рэаліі сённяшняга дня, сучасныя тэндэнцыі ў моладзевым асяроддзі, фармальны падыход у працы з дзецьмі, схільнымі да асацыяльных паводзін.

— Кожны год сталічная сістэма адукацыі прымае больш як 700 маладых спецыялістаў, але замацоўваецца з іх менш за палову. Прычыны вядомыя: большасць пакідае адукацыйную галіну з-за нізкіх заробкаў, і гэта можна зразумець. Але пэўная частка маладых настаўнікаў сыходзіць са школ, таму што адміністрацыя не стымулюе іх да павышэння кваліфікацыі і атэстацыі. Толькі падумайце: праз 5 гадоў работы ў 16 працэнтаў настаўнікаў няма ніякай катэгорыі, — падкрэсліў Уладзімір Шчэрба. — Летась у горадзе змяніліся 19 кіраўнікоў устаноў адукацыі. Сёлета — яшчэ 12. Ратацыя кадраў — звычайная з'ява, аднак не ў тых выпадках, калі кіраўнік не адпавядае пасадзе... За два гады шэсць кіраўнікоў было звольнена з-за выяўлення фактаў карупцыі. Летась 13 працэнтаў зваротаў у Камітэт былі выкліканы нязгодай з дзеяннямі кіраўнікоў. Усе падобныя факты атрымліваюць у грамадстве вялікі рэзананс і ярка выражаную маральную ацэнку.

Не абышлі ўдзельнікі форуму ўвагай і яшчэ адну балючую тэму — арганізацыю і фінансаванне факультатываў эстэтычнай накіраванасці . Варта патлумачыць, чаму ўзнікла гэта рэзананснае пытанне. Згодна з Кодэксам аб адукацыі, вывучэнне дадатковых прадметаў у школах магчымае на факультатыўнай аснове, але пры гэтым вызначана мінімальная напаўняльнасць для арганізацыі заняткаў: не менш як тры вучні у сельскай школе і не менш як пяць у гарадской. Вядома, на факультатывах можна выкладаць рытміку ці акцёрскае майстэрства, але ж навучыцца іграць на музычным інструменце ў групе з пяці ці нават трох чалавек немагчыма. Да апошняга часу школы атрымлівалі дадатковае фінансаванне для аплаты гадзін індывідуальнай работы па тлумачальнай запісцы да вучэбнага плана. Але што будзе з 1 верасня, пасля ўступлення ў дзеянне Кодэкса аб адукацыі? Між іншым, толькі па Мінску ў 86 агульнаадукацыйных установах у эстэтычным напрамку занята больш як 1600 педагогаў. На бліжэйшы год, як супакойваюць у Міністэрстве адукацыі, было прынята рашэнне пакінуць ранейшы парадак: будуць дзейнічаць вучэбныя планы, па якіх установы працавалі і летась. Аднак у далейшым гэтае пытанне будзе вывучацца. Рашэнне абяцаюць прыняць з улікам меркаванняў і педагогаў, і дзяцей.

— Мы разумеем, што ў цяперашняй эканамічнай сітуацыі бясплатнае навучанне ігры на музычных інструментах з'яўляецца для дзяржавы раскошай, але платнае навучанне стане многім сем'ям не па кішэні. Добра, што ў нас ёсць час для вырашэння няпростай задачы. Але пры прыняцці таго ці іншага рашэння трэба памятаць, што якасць адукацыі вызначаецца не толькі глыбінёй і дакладнасцю ведаў, але і ўзроўнем духоўнага развіцця, інтэлігентнасцю і адукаванасцю асобы, — падзялілася сваім бачаннем праблемы **начальнік упраўлення адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы Таццяна БЫЧКОВА.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Сталічная сістэма адукацыі ў лічбах:**

За апошнія тры гады колькасць дзяцей дашкольнага ўзросту павялічылася ў сталіцы на 5 тысяч чалавек. За той жа адрэзак часу колькасць школьнікаў скарацілася ў горадзе на 26 тысяч. Згодна з дэмаграфічным прагнозам, у бліжэйшыя два гады колькасць вучняў сталічных школ стабілізуецца на ўзроўні прыклада 153 тысяч чалавек і ў далейшым пачне паступова павялічвацца.

Сёлета 83 працэнты навучэнцаў пры паступленні ў гімназіі атрымалі адзнакі ад 7 да 10 балаў па ўсіх прадметах.

Больш як 48 працэнтаў дзевяцікласнікаў і 61 працэнт адзінаццацікласнікаў на выпускных іспытах прадэманстравалі веды высокага і дастатковага ўзроўняў.

На цэнтралізаваным тэсціраванні сёлета 30 выпускнікоў-мінчан атрымалі 100-бальныя сертыфікаты.

На заключным туры рэспубліканскіх школьных алімпіяд прадстаўнікі сталічнай сістэмы адукацыі заваявалі 136 дыпломаў, плюс яны заваявалі 26 медалёў рознай вартасці на міжнародных інтэлектуальных конкурсах і алімпіядах.

**Прапановы, якія прагучалі з трыбуны форуму педагогаў сталічных устаноў адукацыі:**

- Знізіць педагагічную нагрузку на выхавальнікаў дашкольных устаноў, што дазволіць папярэдзіць іх эмацыянальнае і псіхалагічнае выгаранне, хранічную стомленасць, якія адбіваюцца на дзецях.
- Работа «класных» класных кіраўнікоў павінна адпаведна ацэньвацца, а не разглядацца проста як даважак да гадзін, якія вядзе настаўнік.
- Пры праектаванні новых будынкаў школ трэба прадугледжваць гульнявыя памяшканні для груп падоўжанага дня, каб дзеці не бавілі ўвесь вольны час паміж школьнымі партамі.
- Для суправаджэння дзяцей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і аказання ім сацыяльнай дапамогі ў штатным раскладзе агульнаадукацыйных школ павінны быць прадугледжаны сацыяльныя работнікі, якія б дапамагалі гэтым дзецям перасоўвацца па школе, перасаджвалі іх з каляскі на крэсла, дапамагалі з асабістай гігіенай, кармленнем, адным словам, суправаджалі іх увесь школьны дзень. Прычым такія работнікі павінны атрымліваць такую ж «дабаўку» з гарадскога бюджэту ў тры базавыя велічыні, як і ўсе мінскія настаўнікі.
- Прадстаўнікі Моладзевай палаты пры Мінскім гарадскім савеце дэпутатаў прапануюць даць абітурыентам права здаваць на цэнтралізаваным тэсціраванні чатыры дысцыпліны, а не тры, што значна пашырыць магчымасці маладых людзей пры выбары месца для навучання, а таксама прапануюць увесці значок, які будзе сведчыць пра наяўнасць школьнага медаля (залатога ці сярэбранага) у яго ўладальніка. Школьны медаль на шыі насіць не будзеш, у адрозненне ад значка на лацкане, які будзе сведчыць пра каласальную работу школьніка на працягу 11 гадоў яго навучання.

Нефармат

# СТРОС-КАН І ЯГО ТАВАРЫШЫ

**ІНТЭРНЭТ паведаміў свету, што з Дамініка Строс-Кана знялі падазрэнні, і ён накіраваўся дадому, у Францыю. Зусім нядаўна «галоўны валютчык свету» сур'ёзна рызыкаваў стаць не шчаслівейшым за самага беднага парыжскага жабрака. Бо «свяціла» яму пажыццёвае зняволенне ў амерыканскай турме. Прыгавор суда да 70-гадовага заключэння азначаў бы менавіта гэта, улічваючы, што амаль 70 ён пражыў на гэтым свеце. Пра тое, колькі гадоў пагражае «злачынцы», паведаміў нават самы лянівы таблоід свету. Гэта калі вызвалілі, то інфармацыя прайшла вельмі сціпленькая, а як арыштоўвалі, усё гуло і стагнала. Ну, адпусцілі, ды і адпусцілі. Каму цяпер асабліва цікавы пенсіянер Строс-Кан?**

А колькі месяцаў таму ўсё было іначай. Кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду жыў у атэлі на Манхэтэне, дзе нумар каштуе 3000 долараў у суткі. І як падрабязна апісвалі ўсе выданні, выйшаў з ванны зусім без адзення ў той момант, калі ў апартаменты зайшла пакаёўка, каб прыбраць. Што было потым, ведаюць дакладна толькі ён ды цемнаскурая дама, якая праз нейкі час пабегла ў паліцыю. Далей газеты пісалі толькі пра яе паказанні. А скардзілася маладая прыбіральшчыца на тое, што пажылы француз прымусіў яе да інтымнай сувязі. Далей — працэс пайшоў. Злашчаснага парушальніка маральных устояў дагналі ў аэрапорце, заламалі рукі і кінулі ў амерыканскую цямніцу. Потым заключэнне, праўда, замянілі на дамашні арышт. І давялося яго роднай жонцы ляцець у Нью-Ёрк, здымаць яму іншыя апартаменты на Манхэтэне (мабыць, таму, што яго асабістыя рахункі на той час замарозілі? — **С.Я.**) і чакаць вынікаў следства.

Самі вынікі, якімі б яны ні былі, кардынальна нічога не мянялі. Бо кар'ера сладастрасніка скончылася ў той момант, калі па тэлебачанні паказалі, як кіраўніку МВФ надзяваюць наручнікі. Большасць каментатараў тады сказала, што прэзідэнт Сарказі пазбавіўся ад канкурэнта, ЗША — ад крыўдзіцеля. І калі даказаць наяўнасць альбо адсутнасць гвалту пакаёўкі пры скрупулёзна праведзеным следстве ўсё ж магчыма, то пацвердзіць факт правакацыі альбо падставы амаль што цалкам нерэальна. Так што бывайце, спадар Строс-Кан як палітык, бывайце назаўсёды. Няхай жыве мадам Лагард!

Цікава, што амаль нідзе так не спачуваюць гаротніку Строс-Кану, як на прасторах былога Савецкага Саюза. Проста ў нас не прынята вялікую ролю надаваць сэксуальным скандалам. А ў іх, наадварот, самае тое. Помніце, за што абмяркоўвалі небараку Клінтана? Не за палітыку яго — за сукеначку Монікі, што абачліва чакала свайго часу ў халадзільніку. Якія ж у іх пільныя і рацыянальныя паненкі, ім бы ўсім да адной у разведцы служыць! І яшчэ, потым, калі Моніка панесла над светам сваю нямытую адзежыну як сцяг перамогі, склалася такое ўражанне, што кожная другая жанчына дзетароднага ўзросту Амерыкі стала ўспамінаць, як яна была разам з бабнікам Білам. А вось свяжэйшы прыклад: WikiLeaks скалынуў свет выкрыццём падрабязнасцяў палітыкі розных краін — і тут жа знайшліся жвавыя кабеты, што прад'явілі абвінавачванне спадару Асанжу ў тым, што ён займаўся з імі сэксам без прэзерватыва. Нічога, што прайшлі гады. Кара за такое злачынства перад асобай не мае тэрміну даўніны.

Альбо Рамана Паланскі злавілі на кінафестывалі з паненкай, якой гадоў для гэтай справы малавата, — і жыццё кінамэтра, мякка кажучы, змянілася не да лепшага. Тут мае значэнне адзін важны нюанс: большасць нашых жанчын у такіх выпадках з сораму згарэлі б, пад катаваннем не выдалі б падрабязнасцяў, — іхнія ж з задавальненнем расказваюць дэталі перад камерамі. І ўсё гэта вядома найшаноўнейшаму Строс-Кану. Дык на каго цяпер наракаць? Ну навошта, скажыце, вельмі багатаму чалавеку, якому ўсё даступна, які падумвае пра магчымую пасаду прэзідэнта краіны, нейкая смуглявая выпадковая прыбіральшчыца? Каб на ўвесь свет потым апраўдвацца, нібы пасаромленаму старшакласніку: так, сэкс быў, але па ўзаемнай згодзе? Часовая слабасць, інстынкт паляўнічага, такая прыцягальная маладая плоць, — мабыць, мужчыны і разумеюць бядовага Дамініка...

У падтрымку Строс-Кана выступалі нават вядомыя расійскія журналісты. Даводзілася чытаць наступнае: «Важуйце сумленна, не бойцеся чалавека ў штанах! Пакіньце пасцельнае пасцелі!» Усё гэта так. Але заклікаць да такіх паводзін заходні свет усё роўна, што даводзіць нашым, як сорамна забруджваць лясы і берагі вадаёмаў смеццем. Усё роўна будуць рабіць па-свойму.

Адзін вядомы на Брэстчыне аграрый савецкай эпохі, расказвалі, у мужчынскай кампаніі заўсёды казаў такі тост: «За мужыкоў, якія на гэтай справе пагарэлі!». У савецкія часы маглі выключыць з партыі і пагнаць з пасады якога-небудзь кіраўніка сярэдняй рукі, калі яго прыгоды станавіліся здабыткам грамадскасці. Вось і пенсіянер Строс-Кан цяпер далучыўся да шэрагаў старшынь калгасаў, якія тады на гэтай справе пагарэлі. Думаць трэба было... галавой.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Заказчик-Застройщик – ОАО «Минскпромстрой».

Зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 698 от 20 июня 2000 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064639.

Лицензия № 02250/0627487, выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь и действительна до 15 марта 2014 года.

Адрес: 220034, г. Минск, пер. Войсковой, 12.

Режим работы: понедельник – четверг 9.00 – 17.45 (обед 13.00 – 14.00), пятница 9.00 – 16.45 (обед 13.00 – 14.00), выходной – суббота, воскресенье.

Выполняя функции Заказчика, в течение последних трех лет ОАО «Минскпромстрой» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 8 по ул. Тимошенко;
- жилые дома №№ 16, 20 по ул. Бурдейного;
- жилые дома №№ 89; 91; 73; 75 по ул. Притыцкого;
- жилой дом № 36 по ул. Чечота.

Цель проекта – Строительство объекта «Многоэтажный жилой дом № 35 (по генплану), в микрорайоне «Дружба-1» по пр. Дзержинского» общей площадью 46 046,88 кв.м, в том числе общая площадь квартир – 39 238,74 кв.м.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – IV квартал 2009 года

Окончание строительства: секции №№ 10-11 – декабрь 2011 г., секции №№ 12-13 – март 2012 г.

Месторасположение объекта – Московский район г. Минска, микрорайон «Дружба-1», вблизи проектируемой станции метро, через пр. Дзержинского гипермаркет «Простор».

Жилой дом запроектирован: 6-7-8-9-14 этажей, 13 подъездов, 16 лифтов, всего квартир – 487, из них: 1-комнатных – 65 шт., 2-комнатных – 195 шт., трехкомнатных – 219 шт., четырехкомнатных – 8 шт. На первом этаже – служебное помещение Товарищества собственников.

Гостевые парковки предусматриваются вдоль проезда и на дворовой территории. Парковочные места автотранспорта планируются в коммунальной зоне микрорайона. Благоустройство внутридворовой территории предусматривает игровое оборудование для детей, пешеходные дорожки, озеленение.

В состав общего имущества объекта входят: лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механические, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Конструкция здания – монолитный железобетонный каркас с плоскими монолитными перекрытиями с переменной сеткой колонн. Наружные стены – кирпич поризованный с утеплением. Окна (за исключением лоджий) – ПВХ профиль с двухкамерным стеклопакетом.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 11.02.2009 г. № 329-5/09. Получены положительные заключения КАиГ 08.10.2008 г. № 10-08/146М, Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 21.10.2008 г. № 02-6/2184.

Получено разрешение Госстройнадзора № 2-203Ж-046/09 от 17.09.2009 г. на производство строительно-монтажных работ.

Участок площадью 4,1008 га передан ОАО «Минскпромстрой» на основании решения Мингорисполкома № 1107 (п. 10) от 21.05.2009 года для строительства объекта. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка и возникновения права на него от 02.07.2009 г. № 500/1054-856.

Заключение договоров создания Объекта долевого строительства проводится по неизменной, на период действия договора цене. На дату опубликования декларации и по 31 августа 2011 г., для юридических лиц и физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, к долевому строительству предлагаются 17 квартир общей площадью 1,2 тыс.$м^2$, расположенных с 1-го по 7 этажи, из них: однакомнатные квартиры общей площадью 51,05 $м^2$ по цене 6,7 млн руб. за 1 (один) кв.м общей площади; двухкомнатные квартиры общей площадью 59,16 $м^2$ по цене 6,7 млн руб. за 1 (один) кв.м общей площади; трехкомнатные квартиры общей площадью 87,08 $м^2$ по цене 6,3 млн руб. за 1 (один) кв.м общей площади и трехкомнатные квартиры общей площадью 96,8 и 99,49 $м^2$ по цене 6,2 млн. руб. за 1 (один) кв.м общей площади.

Заказчиком-Застройщиком по строительству объекта выступает ОАО «Минскпромстрой». Функции генерального подрядчика исполняют филиалы ОАО «Минскпромстрой», выполняя при этом часть работ самостоятельно, а часть по субподрядным договорам со специализированными сторонними организациями.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 312 или по телефонам: 283 15 88; 283 15 78; Velcom (044) 787 12 68.

***Генеральный директор В.С. Нехай***

Трастбанк

*«Банк, основанный на доверии»*

**ЗАО «Трастбанк»**

220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2011 | 01.01.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 24 297,2 | 15 406,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 1 506,4 | 636,9 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 76 908,3 | 33 722,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 96 975,2 | 59 909,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5 040,5 | 3 045,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 313 993,8 | 257 032,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2 287,5 | 2 189,9 |
| 10 | Инвестиции в зависимое юридическое лицо | | 3 949,2 | 1 689,4 |
| 11 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 44 260,4 | 44 955,1 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1111 | 21 942,4 | 18 085,5 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 591 160,9 | 436 672,0 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 45 495,5 | 15 065,8 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 36 764,4 | 21 780,1 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 352 003,5 | 265 850,6 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 44 862,4 | 27 118,4 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 1 950,1 |
| 21 | Прочие обязательства | 1206 | 10 821,3 | 10 051,7 |
| 22 | ВСЕГО обязательства | 120 | 489 947,1 | 341 816,7 |
| 23 | КАПИТАЛ | | | |
| 24 | Уставный фонд | 1211 | 48 785,7 | 48 785,7 |
| 25 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 26 | Резервный фонд | 1213 | 9 719,8 | 4 880,1 |
| 27 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 32 176,1 | 32 176,1 |
| 28 | Накопленная прибыль | 1215 | 10 532,2 | 9 013,4 |
| 29 | Всего капитал, принадлежащий головной организации – банку | | 101 213,8 | 94 855,3 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | 101 213,8 | 94 855,3 |
| 31 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 591 160,9 | 436 672,0 |

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЁТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за январь – июнь 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2011 | 01.07.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 19 440,6 | 17 377,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 18 144,2 | 13 912,9 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 296,4 | 3 464,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 21 177,9 | 18 766,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 923,6 | 780,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 254,3 | 17 985,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 83,1 | 66,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | (14,5) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 3 931,1 | (302,4) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (473,3) | 311,5 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7 573,0 | 9 840,7 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5 025,7 | 1 133,3 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 14 260,1 | 10 720,6 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 969,3 | 1 688,5 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 314,9 | 394,7 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 1 216,3 | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 4 098,6 | 394,7 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | 421,0 | 52,9 |
| 19 | Итого прибыль (убыток) | | 4 519,6 | 447,6 |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк»** **Ю.М. Каштанов**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Бродик**

**Дата подписания 24 августа 2011 г.**

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 13.11.2008 г. НБ РБ.

Дзённікі
Сшыткі
Алоўкі
Ласцікі
Ручкі
І ўсё неабходнае для вашага вучня
Вы можаце набыць у крамах і кіёсках
РУП «БЕЛСАЮЗДРУК»
РУП "Белсаюздрук" УНН 100071552

## КАПУСНАЯ РАСАДА

**Высадку капуснай расады прымяркоўвалі да аднаго з вясновых свят — напрыклад, да Івана Галавастага (7 чэрвеня). Казалі: «Каб мая капустачка прымалася і ў галоўкі складалася»; на Розыгры (аўторак на наступным за Тройцай тыдні), каб расліны добра фарміраваліся ў галоўкі.**

● Не саджалі капусту ў панядзелак, аўторак, чацвер (так званыя мужчынскія дні), на маладзіку; у першыя дні пасля поўні — пра такую капусту казалі «гнілец», г.зн. згніе; у «сухі дзень» (аўторак перад Пасхай) — капуста пойдзе ў храпкі; у «крывую сераду» (апошняя перад Тройцай) — будзе крывая і маленькая; у той дзень тыдня, калі ўвосень пайшоў першы снег.

● З вечара на градкі пад капусту ставілі ўверх дном гаршчок, у якім была крапіва з коранем, і казалі: «Не будзь пустая, будзь густая; не будзь старая, будзь маладая; не будзь малая, будзь вялікая!»

● Пры пасадцы расады забаранялася есці хлеб, каб куры летам не дзяўблі капусту; смяяцца — інакш лісты капусты будуць маршчыністыя.

● Ведалі, што саджаць капусту павінна толькі жанчына. Калі да расады дакранецца мужчына, то добрага ўраджаю не будзе.

● Першую пасаджаную расліну накрывалі чыгуном, чыгун — белым абрусам. Зверху клалі камень і казалі: «Дай, Божа, час добры, каб капуста мая прымалася і ў галоўкі складалася».

● Лункі для раслін трэба было рабіць бярозавым колам.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

### Усміхнемся

Дыялогі ў сеціве.
— Ты падабаснік!
— Я мужчына, здольным на разумныя і абгрунтаваныя кампрамісы дзеля сэксу і бацвіння.



☺

**У нашай гімназіі настаўнікі забараняюць нам жаваць гумку, і таму нам даводзіцца смаліць, каб адбіць яе пах.**

☺

З дапамогай бутэлькі гарэлкі табурэтка лёгка ператвараецца ў крэсла-гойдалку.

☺

**Дзіця, якое спіць, — гэта не толькі міла, але і НАРЭШЦЕ!**

## А СЯБРАВАЦЬ МОЖНА І ГАЛЕРЭЯМІ... Выстава

**Адзін народны мастак з выставай прыходзіць у госці да другога.**



«Вечаровая гармонія» акварэляў Гаўрылы Вашчанкі размясцілася ў галерэі Шчамялёва. У Леаніда Шчамялёва ёсць «імянная» галерэя ў Мінску. У Гаўрылы Вашчанкі — у Гомелі. Але ж «імянная» галерэя не азначае, што выстаўляць там трэба толькі свае творы. Можна з задавальненнем прадстаўляць сяброў ці іншых добрых людзей: мастакоў, якіх хочуць выстаўляць — шмат. А вось выставачных плошчаў...

Гаўрыла Вашчанка — з тых мастакоў, творчасць якіх не абдзелена ўвагай, што ў Беларусі, што за яе межамі. Але каб толькі акварэлі выстаўляліся — такое ў яго багатай творчай біяграфіі здарылася ўпершыню. Хоць майстэрствам акварэліста народны мастак валодае выдатна, таму што быў вучнем Тацяны Яблонскай, яркай постаці савецкага мастацтва. Тое, што вучнем ён аказаўся добрым, стане зразумела пасля прагляду больш дваццаці прац, якія выстаўлены ў галерэі Шчамялёва, дзе шмат гадоў ажыццяўляецца праграма «Беларуская акварэль».

Аднак пакуль працы Вашчанкі знаходзяцца ў гасцях у мінскай галерэі Шчамялёва, то па-сяброўску прадугледжаны ход у адказ. Частка калекцыі народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва, які быў лаўрэатам прэміі Саюзнай дзяржавы, паедзе ў галерэю Вашчанкі: трэба ж у сталіцы Саюзнай дзяржавы мець творчую справаздачу.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД**

**Па гарызанталі:** Штраф. Лімонніца. Рэверс. Сядло. Тацыт. Ном. Арэлі. Агні. Наватар. Кар. Транс. Сайт. Цырата. Бал. Канада. Коі. Рак. Бор. Зарын. Абход. «Нос». Карп. Тэраса. Плаха. Ігар. Танк. Махаон. Адмірал.

**Па вертыкалі:** Капусніца. Парусьнік. Тавар. Абібок. Цытата. Ода. Форт. Алюр. Старт. Паліто. Лівія. Аган. Драна. Бохан. Марал. Арка. Онікс. Зэт. Лава. Марс. Акарына. Іней. Данос. Трак. Салідол.



Дарагая дачушка, унучка, сястра, пляменніца, хрэсніца, шаноўная суседка і цяпер студэнтка БДУ юрыдычнага факультэта **Марына Генадзьеўна ПАДГОРНАЯ** са Слуцка! Прымі нашы сардэчныя віншаванні з нагоды 18-годдзя з дня нараджэння. Зычым здароўя, выдатнай вучобы. Няхай бацькоўская настойлівасць, шчырасць, дабрыня і прыстойнасць будуць тваімі спадарожнікамі ў жыцці.

**Тае родныя і Новікі.**

Віншуем **КУЧУК Сяргея з Юрацішак** з юбілеем! Шчасця, дабра, здароўя.

**Родныя.**

### Формула ўдачы

## КНІГА ПРА КНІГІ

**Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прадставіў сваю кнігу.**

Раман Матульскі піша пра тое, што больш за ўсё любіць і цэніць: пра кнігі і пра тое, як з імі працаваць у сучасных бібліятэках. Яго працы асабліва карысныя для прафесіяналаў гэтай справы. Аўтар каля 250 навуковых публікацый днямі прэзентаваў кнігу «Асноўныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнай справы Беларусі ў кантэксце нацыянальнай і агульнаеўрапейскай гісторыі». Якая ўдзячная глеба для вывучэння — гісторыя кнігі ў Беларусі, ёсць пра каго пісаць, ёсць куды паглыбляцца. Ёсць куды імкнуцца. А вынікі навуковых пошукаў дырэктара галоўнай бібліятэкі краіны могуць спрыяць фарміраванню як сукупнага бібліятэчнага фонду Беларусі, так і нацыянальнай электроннай бібліятэкі. За ўсё добрае для ўсіх нашых бібліятэк Рамана Матульскага ўзнагародзілі знакам Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.08 | 20.13 | 14.05 |
| Віцебск — | 5.55 | 20.06 | 14.11 |
| Магілёў — | 5.58 | 20.03 | 14.05 |
| Гомель — | 5.58 | 19.57 | 13.59 |
| Гродна — | 6.24 | 20.27 | 14.03 |
| Брэст — | 6.28 | 20.25 | 13.57 |

### Месяц

*Маладзік 29 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

**Пр.** *Евы, Еўдакіі, Аляксея, Аркадзя, Васіля, Маркела, Мікалая, Міхея, Уладзіміра, Фёдара, Фядоса.*

**К.** *Монікі, Тодара, Цэзара, Юзафа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.






## 27 жніўня

### Дзве даты



**1860 год** — нарадзіўся (маёнтак Станькава, зараз Дзяржынскі раён) Карл Эмерыкавіч Чапскі, адзін з прадстаўнікоў старадаўняга роду Гутэн-Чапскіх. У 1882 годзе скончыў Дэрптскі (Тартускі) універсітэт. У 1890-1901 гадах — гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў многія грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак, шпіталь, амбулаторыю, пусціў электрастанцыю, трамвай, забрукаваў вуліцы. Садзейнічаў адкрыццю ў Мінску Таварыства аматараў спорту (з 1892 года яго старшыня), Таварыства аховы жанчын, гарадскога крэдытнага таварыства. Быў актыўным членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Пабудаваў піўзавод «Багемія», прададзены пасля сямейству Лекертаў. Памёр у 1904 г.

**551 год да н.э.** — нарадзіўся Кун Фу-цзы, больш вядомы як філосаф, палітык і настаўнік Канфуцый, заснавальнік дзяржаўнай рэлігіі Кітая — канфуцыянства. Жыццё Канфуцыя, у параўнанні з яе велізарным уплывам на цывілізацыю, было на дзіва спакойным, нават сумным, але кітайцы лічаць яго ідэальным і кажуць, што яго жыццё было «простым і сапраўдным». Наогул, асновай філасофіі Канфуцыя з'яўляецца ўпэўненасць у тым, што любы чалавек можа стаць лепшым і разумнейшым, а таксама вера ў здольнасць звычайнага чалавека стаць легендай і нават напаўбогам.

### Цытата дня:

*«Даражэй за ўсе тытулы — добрае сэрца».*
**Алфрэд Тэнісан (1809—1892), англійскі паэт.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**СЕЗОН НАРЫХТОВАК**

## Балгарскае леча «Глобус»»

***Спатрэбіцца:*** *памідоры — 2 кг, балгарскі перац — 1,5 кг, цыбуля — 500 г, морква — 500 г, алей — 1 шклянка, цукар — 1 шклянка, воцат (9%) — 0,5 шклянкі, соль — 3 ст. л.*

Памідоры памыць, перац, моркву, цыбулю — ачысціць. Памідоры і цыбулю перакруціць на мясарубцы і варыць на слабым агні 1 гадзіну, перыядычна памешваючы. Моркву надзерці на сярэдняй тарцы і пасіраваць на алеі 10 хвілін. Затым разам з перцам, нарэзаным саломкай, дадаць да памідораў. Пасаліць, пасаладзіць, уліць воцат, алей, які застаўся, і варыць 15 хвілін. Потым раскласці ў стэрылізаваныя слоікі, закатаць, перавярнуць уверх дном, ахінуць коўдрай і пакінуць да поўнага астывання.

## Салата з кабачкоў

***Спатрэбіцца:*** *вядро кабачкоў (ачышчаных ад скуры і насення і нарэзаных кубікамі шырынёй 1,5—2 см), 0,5 л алею, шклянка цукру, 2 ст. лыжкі солі, 300 г воцату, чайная лыжка молатага чорнага перцу, 0,5 л таматнага соусу, шклянка здробненага часнаку.*

Падрыхтаваныя кабачкі пакласці ў каструлю (пажадана з тоўстым дном), дадаць усе інгрэдыенты, акрамя часнаку, і варыць на слабым агні пад накрыўкай 40 хвілін, перыядычна памешваючы.

Выключыць агонь і дадаць здробнены часнок. Старанна перамяшаць, раскласці ў стэрылізаваныя слоікі і закатаць. Ухутваць і пераварочваць слоікі не трэба.

## Аджыка

***Спатрэбіцца:*** *памідоры — 2,5 кг, морква — 1 кг, перац салодкі — 1 кг, яблыкі (пажадана кіслыя) — 1 кг, цукар — 200 г, воцат — 200 г, алей — 200 г, соль — 50 г, перац востры — 2—3 штукі (каля 100 г), часнок — 1 шклянка.*

Гародніну памыць, пачысціць і прапусціць праз мясарубку. Пакласці ў каструлю і тушыць 55 хвілін пад накрыўкай, перыядычна памешваючы. Пасля дадаць усе астатнія інгрэдыенты, акрамя часнаку і патушыць яшчэ хвілін 5. У канцы дадаць часнок і раскласці ў стэрылізаваныя слоікі, закатаць. Ухутваць і пераварочваць слоікі не трэба.



## Стэрылізацыя слоікаў

**Вы ўсё яшчэ стэрылізуеце слоікі на вадзяной лазні? Калі надакучыла парыцца разам са слоікамі, час пераходзіць на сухія спосабы стэрылізацыі.**

Самы просты спосаб сухой стэрылізацыі — у духоўцы. Добра вымыйце слоікі (лепш з дапамогай соды або мыльнага раствору, пазбягаючы «неядомых» мыйных сродкі для посуду). Пастаўце слоікі ў халодную або цёплую духоўку. Нагрэйце духоўку да 150 градусаў, пры такой тэмпературы трымайце слоікі ў духоўцы 15 хвілін. Пасля гэтага слоікі можна вымаць і раскладваць у іх прадукты для кансервацыі. Калі вы прастэрылізавалі слоікаў з запасам, пастаўце іх на чысты ручнік дагары дном (бо ў іх маюць звычай «падаць» бактэрыі).

Адна з галоўных пераваг духоўкі — яе габарыты. Напрыклад, за адзін раз можна апрацаваць дзясятак паўлітровых слоікаў або прадэзінфікаваць чатыры трохлітровыя.

У духоўцы стэрылізуюць і запоўненыя слоікі. Пастаўце іх у духоўку без накрывак. Разагрэйце духоўку да 100 градусаў. Мінімальны час стэрылізацыі пасля дасягнення патрэбнай тэмпературы — 10 хвілін (для слоікаў 0,5 л), 15 хвілін — (для 1 л).

**-2780-**

**ЦІКАВЫЯ ДРОБЯЗІ**

## Як завязаць шнуркі?

Як не шкада, але ўжо з дня на дзень давядзецца развітацца са зручнымі басаножкамі і перайсці на туфлі, чаравікі і красоўкі. Каб гэтае развітанне не было такім сумным, паспрабуйце шнуркі ў сваім восеньскім абутку ці абутку дзяцей завязаць не зусім звычайным спосабам. Магчыма, гэта ўзніме ваш настрой.



**-2781-**

# КАВУНОВЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ У ЮНІШЧАХ

**Вось ужо больш за дзесяць гадоў на прысядзібным участку Бароўскіх растуць кавуны. Эксперымент, ініцыятарам якога была Наталля Аляксееўна Бароўская, удаўся. Хоць першапачаткова ніхто не верыў у гэтую ідэю.**



— Угаворвала сваю свякроў: «Давайце пасадзім». А ў адказ чула, што гэта не мае сэнсу, — дзеліцца Наталля Аляксееўна.

І вось паспрабавалі. Проста пасадзілі зярняткі ў зямлю на невялікім участку, а восенню сабралі ўраджай. Першая пасадка кавуноў была перад домам: кожны, хто праходзіў ці праязджаў па вуліцы, мог назіраць гэтае дзіва: у беларускай вёсцы каля сялянскай хаты на градцы грэлі свае бакі вялізныя паласатыя ягады.

Першапачаткова кавуны былі пасаджаны з купленага насення і выбранага са смачных экзэмпляраў, завезеных да нас з-за мяжы. Аднак гаспадыня заўважыла, што лепш за ўсё яны растуць са свайго насення. Так з года ў год, адбіраючы лепшыя кавуны, выводзіла свой сорт.

Ніякай лішняй работы пры вырошчванні гэтага віду гаспадыня не робіць. З вясны на ўвесь агарод уносяць угнаенне. У маі — дзесьці з шостага па дзясятае (як звычайна агуркі ў адкрыты грунт) высявае насенне. Адлегласць паміж радкамі — крыху больш за метр. Прыкладна метр паміж лункамі ў радку. У кожную з іх, не шкадуючы, Наталля Аляксееўна засыпае насенне — па штук дзесяць. А далей проста чакае.

Вядома, патрэбна папалоць — а гэта ў дачыненні да бахчы вельмі далікатная справа: плеці лёгка ламаюцца.

Нават у гэтае спякотнае, без дажджу ў першай палове лета яны не палівалі градку з кавунамі. З калодзежа на такі ўчастак вады не нацягаешся. Сёлета пад кавунамі ў Бароўскіх крыху больш за сотку зямлі. Плеці расліны ўжо выйшлі за межы сваёй тэрыторыі і папаўзлі на суседнія градкі.

Ураджай пачынаюць збіраць з канца жніўня. Прыкладна да сярэдзіны верасня паспяваюць усе кавуны. Далей іх захоўваюць у склепе. Такім чынам, сям'я, яе госці, родныя і знаёмыя ласуюцца сакавітай ягадкай аж да лістапада.

Летась Наталля Аляксееўна дзесьці ў канцы жніўня пералічыла кавуны на градцы. Налічыла крышку больш за сто штук! Нядрэнны ўраджай. Самыя вялікія дасягаюць сямі-васьмі кілаграмаў. Бываюць, вядома, і крыху меншыя, аднак усе яны ўражваюць і памерам, і колькасцю, і смакам.

Наталля Аляксееўна пачаставала кавуном — спелым, сакавітым, салодкім. Не верылася, што ён вырашчаны вось тут — на Палессі, а не прывезены з Астрахані.

Сама Наталля Аляксееўна працуе паштальёнам у Столінскім раённым вузле паштовай сувязі. Жыве ў кватэры. На Юнішчанскія хутары прыязджае па выхадных. Дапамагаюць дзеці, свой пасільны ўклад уносяць і ўнукі — пяці- і шасцігадовыя хлапчукі. Хоць часцей за ўсё яны ласуюцца гэтым юнішчанскім дзівам, якое стала для іх звычным. Яны ж з першых гадоў свайго дзяцінства назіраюць, як тут на агародзе іх прабабулі Алены Ануфрыеўны растуць кавуны.

Наталля Аляксееўна — не мясцовая. Сям'я пераехала на радзіму мужа з Кемерава ў 1990 годзе. Хоць яна мае карані тут — на Століншчыне, на тых жа Юнішчанскіх хутарах. Менавіта там жылі яе дзядуля і бабуля, да якіх яна прыязджала на лета.

Так, родная зямля дапамагае і жыць, і расціць, і праводзіць эксперыменты. Нават вось з такой зусім не мясцовай ягадай.

**Таццяна СЕГЕН. Фота аўтара.**

*Столінскі раён.*

### Фестывалі

## ВОЛЬНАЕ ЭТНА

**Музыканты з розных краін змогуць удыхнуць чыстае паветра, адчуць дух беларускага хутара, хараство нашай прыроды.**

Субота, 27 жніўня. Хутар Шаблі. Тут вольна дыхаецца: няма гарадской мітусні, пастаральныя пейзажы, сярод якіх чалавек сябе адчувае гаспадаром неабсяжнае прасторы ці шаноўным госцем, якога даўно чакалі. Гасцей тут будзе шмат: з Сербіі, Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі... І ўсе іграюць ды спяваюць фолк.

Чаго здзіўляцца, што яны прыехалі ў Беларусь, каб выканаць сваю музыку? У нас з гэтым напрамкам поўны парадак, самі дадзім жару і пакажам клас, калі трэба, прычым наш фолк таксама можа быць вельмі розным — традыцыйным ці эксперыментальным. Задача міжнароднага фестывалю навага этна «Вольнае паветра» — пазнаёміць з тым, як выкарыстоўваюць фальклор у сучасным свеце, у самых розных культурах, але трактуючы яго ў найноўшых музычных накірунках, нават у электроннай музыцы ці хіп-хопе. Як гучыць балканскі рэйв, чым вылучаецца праваслаўны хіп-хоп ці як выглядае індыйская дыскатэка?.. А вось беларускім фолк-джазам нашых меламанаў, напэўна, не здзівіш. Затое зацікавіш спецыяльным госцем: гурт «Яблычны чай» прадставіць нашу краіну са сваім эксперыментальным альбомам «Bee Dance», створанага дзесяць гадоў таму.

«Запальваць» на хутары збіраюцца не толькі ноччу, хоць арганізатары павінны былі прадумаць усё да дробязяў — у прыватнасці, пра месцы прыстанку для тых, хто набыў білеты. Гэтая ноч на хутары для вельмі прасунутых: літаральна пад адкрытым небам адбудуцца паказы міжнароднага фестывалю незалежнага кіно «DIY Film Fest» (Польшча), якія адлюстроўваюць уплыў на свет контркультуры.

Контр — значыць супраць. У кантэксце «хутарскога» быцця гэта можна разглядаць як супраціў гарадскому. Чаго ў горадзе дакладна няма — дык гэта каровак, якія даюць смачнае малако. Але і пакідаюць пасля сябе «міны». На «Вольным паветры» гэтую зброю пусцяць у ход: арганізатары абяцаюць чэмпіянат па кіданні каровіных аладак, якія ў свой час прыдумалі індусы. Вось і забаўляльнае этна!...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 4126. Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2011 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12